Да заканчэння падпіскі на "Народную волю" засталося два дні. Не спазніцеся!

№№195–196
(2923–2924)

23—29 снежня 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

У сувязі са святамі і выхаднымі наступны нумар газеты выйдзе 30 снежня.

# Народная Воля

*Шаноўныя чытачы!*
*Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93,*
*усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.*

**СА СВЯТАМ!**

## Бог прыйшоў да нас у вобразе чалавека

*З пастырскага паслання Арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча, мітрапаліта Мінска-Магілёўскага на Божае Нараджэнне*



"Не бойцеся, я абвяшчаю вам вялікую радасць: нарадзіўся вам сёння ў горадзе Давіда Збаўца, якім ёсць Хрыстус Пан". (пар. Лк 2, 10—11).

Глыбокапаважаныя браты ў святарстве, шаноўныя законнікі і законніцы, умілаваныя браты і сёстры! Гэтымі словамі, з якімі Анёл звярнуўся да пастушкоў, ад усяго сэрца вітаю вас ва ўрачыстасць Божага Нараджэння. Словы гэтыя адлюстроўваюць асноўны сэнс сённяшняга свята, бо абяцаны Богам Айцом яшчэ нашым прабацькам Адаму і Еве, прадказаны прарокамі, доўгачаканы Збаўца нарэшце прыйшоў у гэты свет — прыйшоў у вобразе звычайнага чалавека...

Доўгія тысячагоддзі чалавецтва чакала Божага госця, які змог бы адказаць на пытанні, што яго хвалявалі. Сённяшняя ноч Божага Нараджэння сведчыць пра тое, што ўжо больш не трэба чакаць. Да нас прыйшоў не проста нейкі прышэлец, не іншапланецянін, але хтосьці значна большы — прыйшоў сам Бог; прыйшоў, каб дапамагчы загубленаму ў гэтым свеце чалавеку знайсці Яго і зразумець самога сябе...

Прыйсце Сына Божага ў свет стала сапраўднаю рэвалюцыяй як для самога чалавека, так і ў яго адносінах з Богам. Гледзячы чыста чалавечымі вачыма на народжанага ў беднасці Езуса, можна спытацца, а што новага Ён, які распачаў сваё жыццё ў бэтлеемскай стаенцы, а завяршыў на дрэве крыжа, прынёс у наш свет і нашае жыццё?

...Ён зрабіў тое, чаго сам чалавек ніколі не змог бы зрабіць. Ён з'явіўся перад людзьмі як уцелаўлёны Бог, Бог з чалавечым абліччам і сэрцам. Дзякуючы гэтаму Бог стаў блізкім чалавеку і яго патрэбам — міласэрны і ў той жа час справядлівы. Праз сваё ўцелаўленне Езус надаў сэнс жыццю чалавека і вярнуў яму годнасць Божага стварэння. Ён не ацэньвае чалавека на падставе колеру скуры, мовы, адукацыі, банкаўскага рахунку, здольнасцяў ці іншых другасных рэчаў, але робіць гэта паводле крытэрыяў нязменнай вартасці. Ён першы сказаў тое, што сённяшняя дэмакратыя любіць прыпісваць сабе, а менавіта, што чалавек — гэта не нейкая рэч, і адны людзі не могуць выкарыстоўваць іншых. Такім чынам Ён падкрэсліў роўнасць усіх людзей. Дзякуючы Яму кожны чалавек з'яўляецца дзіцем Божым і братам Богачалавека, пакліканым да вечнага шчасця...

Езус — гэта Эмануэль — Бог з намі, Бог у нашай чалавечай прыродзе, у нашай чалавечай гісторыі, у нашым жыцці — вось тыя вялікія праўды, вось тая рэвалюцыя, якую зрабіў Езус. Здзейснілася мара чалавека сваімі вачыма ўбачыць Бога-Збаўцу...

Езус і сёння стукаецца ў дзверы нашых сэрцаў. Ён хоча ўвайсці і зрабіць у іх духоўную рэвалюцыю, бо як жа шмат людзей сёння жыве так, як быццам Бога зусім няма, або згадваюць пра Яго толькі на Божае Нараджэнне ці на Вялікдзень! Як жа шмат людзей сёння не хочуць ісці ў касцёл, каб толькі не сустрэць там жывога Хрыста! ...Бо чалавек хоць і ведае, што з'яўляецца духоўна хворым, але пры гэтым свядома не жадае лячыцца...

...Простым вокам відаць, што чалавек згубіў шлях да Бога, а таму ў час нябачанага дагэтуль прагрэсу і эканамічнага развіцця ён жыве ў пастаянным страху і непакоі за сваю будучыню.

Пацвярджае гэта і выбух фінансавага крызісу, што ў апошні час ахапіў увесь свет... Гісторыя яшчэ раз паказала, што трывалым фундаментам нашага жыцця з'яўляецца Бог і Ягоная праўда, а не матэрыяльныя каштоўнасці.

Мы радуемся, што нашыя касцёлы сёння поўныя, што ў іх шмат людзей, што дзеці з захапленнем падыходзяць да яселек, што адбываюцца батлейкі і мы весела спяваем Калядкі. Але для сапраўднага перажывання Божага Нараджэння гэтага крыху замала. Езус павінен нарадзіцца сваёю ласкаю ў нашых душах, каб яны сталі Бэтлеемам нашага часу...

Езус прыходзіць да нас у сакрментах і Божым слове. Пра гэта варта ўзгадаць асабліва цяпер, калі мы разам з усім паўсюдным Касцёлам адзначаем Год святога апостала Паўла, які нястомна абвяшчаў Божае слова язычнікам, верачы ў тое, што яно — гэта сам Езус Хрыстус, Бог і чалавек.

Ад усяго сэрца віншую вас, браты і сёстры, а таксама ўсіх людзей добрай волі з урачыстасцю Нараджэння Пана!

Віншую вернікаў іншых хрысціянскіх канфесій, асабліва братняй Праваслаўнай Царквы. Езус прыйшоў да ўсіх людзей, і ўсе мы, хоць і належым да розных хрысціянскіх супольнасцяў, верым у аднаго Збаўцу, які нарадзіўся з Панны Марыі ў Бэтлееме, і вызнаем тую самую веру ў Богаўцелаўленне. Наша супольнае імя — хрысціянін — паходзіць ад Хрыста — нашага Збаўцы. Таму і наша вера і радасць — супольныя...

Жадаю вам радасці ў нованароджаным Месіі! Няхай Ён сваёю ласкаю заўсёды нараджаецца ў нашых сэрцах...

Давяраючы ўсіх вас апецы Багародзіцы Марыі, якая дала свету Збаўцу Езуса Хрыста, ад усяго сэрца благаслаўляю ў імя Айца, і Сына, і Духа Святога. Амэн.

## *На «пікавую сітуацыю» рэзерваў не хопіць*

"Золатавалютных рэзерваў у Беларусі дастаткова для падтрымкі краіны, але не для працы ў пікавай сітуацыі", — заявіў міністр эканомікі **Мікалай Зайчанка**, выступаючы на сумесным пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў і Савета рэспублікі Нацыянальнага Сходу.

Міністр паведаміў, што рыхтуецца праект дакумента аб увядзенні падатковага крэдыту, у адпаведнасці з якім прадпрыемствы не будуць плаціць на працягу паўгода падатак на прыбытак і падатак на дададзены кошт з наступнай іх кампенсацыяй. Апрача таго, рыхтуецца пералік прадпрыемстваў, якім будзе на 50% ільгатавацца працэнтная стаўка па банкаўскіх плацяжах.

## *Нацбанк рэкамендаваў банкам не выдаваць крэдыты ў валюце*

Галоўная фінансавая ўстанова краіны *"настойліва рэкамендавала"* камерцыйным банкам спыніць выдачу валютных крэдытаў насельніцтву. Пра гэта "Інтэрфаксу" паведаміў прадстаўнік аднаго з камерцыйных банкаў.

Паводле суразмоўцы агенцтва, Нацбанк тлумачыць гэта складанай сітуацыяй на ўнутраным валютным рынку краіны. У лісце, які накіраваны ў камерцыйныя банкі, рэкамендавана ўзмацніць кантроль за мэтавым выкарыстаннем спажывецкіх крэдытаў, выдаваць спажывецкія крэдыты ў рублях і толькі на набыццё тавараў беларускай вытворчасці.

У прэс-службе Нацбанка каментаваць гэтую інфармацыю адмовіліся.

## *Мараторый на праверкі*

У Беларусі ўводзіцца мараторый на правядзенне праверак юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў. Адпаведнае распараджэнне ўтрымліваецца ва ўказе № 689 "Аб некаторых мерах па ўдасканальванні кантрольнай і наглядной дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь", які падпісаў Аляксандр Лукашэнка.

"Улічваючы шматлікія скаргі суб'ектаў гаспадарання на немагчымасць нармальна працаваць з-за вялікай колькасці праверак, няўзгодненасць іх правядзення кантрольнымі органамі, прызначэнне праверак па фармальных падставах і па меркаванні кантрольных і наглядных органаў, прэзідэнт прыняў рашэнне аб прыпыненні правядзення кантролю і нагляду за дзейнасцю юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў у форме праверак", — зазначаецца ў паведамленні прэс-службы прэзідэнта.

Усе праверкі, якія зараз праводзяцца, і звесткі аб правядзенні якіх ужо ўнесены ў кнігу ўліку рэвізій, павінны быць завершаны на працягу 14 дзён.

Згодна з указам выключэнне робіцца ў дачыненні да праверак (рэвізій), якія праводзяцца па ініцыятыве самога суб'екта гаспадарання, напрыклад, у сувязі з яго рэарганізацыяй або ліквідацыяй.

## *Накрылі!*

На чатырох рынках Віцебска каля двух гадоў гандлявалі спіртнымі напоямі, якія нелегальна ўвозіла ў краіну арганізаваная злачынная група.

Кантрабанднае спіртное прадавалася значна танней, чым у крамах. Пры затрыманні ў прадаўцоў забралі больш за 600 бутэлек розных спіртных напояў агульным коштам больш за 12 мільёнаў рублёў.

**"АТОМНЫЙ ПРОЕКТ"**

*Павел АТРУШКЕВИЧ*
*прафесар:*

## «Если уж вопрос строительства АЭС не в компетенции президента, то какие тогда вопросы находятся на его рассмотрении?»

Решение о строительстве белорусской АЭС на Островецкой площадке принято. Мы с профессором **Павлом Александровичем Атрушкевичем** с этим интервью опоздали. И все-таки решили использовать призрачный, но шанс. Возможно, у авторов белорусского "атомного проекта" хоть что-то дрогнет. Ведь они не могут не понимать, какую ответственность на себя взяли.

Павел Атрушкевич — заслуженный деятель науки Республики Казахстан, член-корреспондент Академии наук высшей школы Казахстана, действительный член Международной академии экологии и природопользования, почетный доктор наук Белорусской сельскохозяйственной академии, почетный профессор Ассоциации высших учебных заведений, которые готовят специалистов в сфере строительства… Можно долго перечислять регалии моего собеседника, но даже несмотря на них белорусские власти не приняли его предложения о помощи в поиске безопасной площадки для будущей белорусской АЭС. Атрушкевич послал письмо Александру Лукашенко, надеясь, что президент найдет время лично встретиться по столь важному вопросу или хотя бы поручит встретиться кому-нибудь из помощников. Но глава белорусского государства времени не нашел. Письмо переправили в Совет министров, оттуда — в Академию наук, потом — в один из отраслевых институтов, и уже здесь мелкий клерк посчитал, что в его институте такие крутые специалисты, что ничья помощь им не требуется. Между тем наш земляк Павел Александрович Атрушкевич, долгое время работавший в Казахстане, — всемирно известный специалист по изучению тектонических разломов и микросейсморайонированию. Он искренне верил, что в Беларуси на самом деле пытаются найти безопасную площадку под АЭС и что его услуги потребуются. Он до последнего ждал вызова в высокие кабинеты и даже подготовил план своего выступления перед президентом на тему "Изучение геодинамики земной коры в связи с выбором площадки для строительства АЭС в Беларуси". Он по восьми позициям хотел объяснить, что и как надо делать, чтобы не ошибиться в выборе безопасной площадки для атомной станции, но его никто никуда не позвал...

*— Я утверждаю, что белорусские специалисты не могут сказать, где конкретно, в каком именно месте проходит разлом земной коры,* — категорично заявляет Атрушкевич. — *Они не провели соответствующие исследования и знают только приблизительную зону разлома. Я ни у кого не хотел забирать хлеб, я готов был выступить консультантом и научить, объяснить, как такие исследования проводятся, поскольку имею огромный опыт в этой сфере.*

И Павел Атрушкевич начинает выкладывать передо мной таинственные карты, испещренные линиями и значками. Он в одном из закрытых городов России, где делали ядерные ракеты, изучал причины попадания в реку радиактивных отходов, он входил в состав государственной комиссии по оценке ущерба от землетрясения в Газли, он участвовал в подборе площадки для Рижской АЭС, изучал, как ведут себя тектонические разломы на специально созданных алма-атинском и талгарском полигонах. В конце концов он создавал первый в СССР полигон, наблюдения на котором позволили ученым хотя бы понять, что же есть тектонический разлом и чем он опасен.

"Полигон" тут слово ключевое. Павел Александрович утверждает, что без создания специального полигона белорусские ученые просто не могли определить, какую площадку они выбрали.

*— Геологи своими методами могут определить зону разлома. Для того, чтобы его обнаружить с точностью до метров, необходим геодинамический полигон с сетью геодезических опорных точек в виде реперов разной глубины, "якорь" которых должен находиться ниже зоны промерзания, а часть - в зоне постоянных температур. И тогда после проведения тщательных замеров будут исключены сезонные колебания и выявлены участки, где фиксируются наибольшие вертикальные движения земной коры. И уже эти участки надо изучать более пристально, сужая зону наблюдения: чем чаще будут точки наблюдения, тем более точно можно определить разлом.*

**— И как долго должны вестись такие исследования?**

*— Минимум — год. Но потом еще и на протяжении всего периода строительства. Потому что очень важны и скорость сдвигов, и равномерная просадка пластов, и, собственно, геологические грунты, и многое-многое другое.*

**— Приборы позволяют фиксировать и горизонтальные, и вертикальные сдвиги?**

*— Да, уже есть приборы, которые позволяют зафиксировать и горизонтальные сдвиги, наиболее распространенные в Беларуси. Кстати, в этой связи могу вспомнить историю, которая случилась в Казахстане с Сары-Агачским элеватором. Его просто разорвало пополам, так как оказалось, что элеватор был построен на разных инженерно-геологических пластах. При строительстве элеватора ни о каком разломе вообще не думали, главным было, чтобы он оказался поближе к железной дороге. Что получилось в результате, я вам рассказал.*

**— А как часто геологи ошибаются, проводя исследование участков под АЭС традиционными методами?**

*— К сожалению, такие случаи известны. Классический пример — Игналинская АЭС. При ее строительстве знали, что площадка выбрана в зоне разлома и, более того, хотели станцию от разлома отодвинуть, потому "скорректировали" проект, исходя из бытовавших в геологической науке представлений. В результате именно на разлом станцию и "посадили". Чудом не "посадили" на разлом Рижскую АЭС, благо, Институт физики земли вмешался в этот проект, зато на разломе оказалась Рижская ГЭС. Поверьте, я много работал с участками, где на картах геологами были обозначены разломы. Но при более тщательном исследовании практически всегда оказывалось, что и разлом не там, и проходит он не так. Причем ошибки составляли не метр и даже не сто метров, случалось, что и на километр "промахивались", и на два.*

**— Островецкую площадку специалисты называют "расколотым блюдцем" — зоной, где проходят разломы земной коры. Можно ли там вообще что-то строить?**

*— В таких местах особенно важно знать, где именно находится разлом. "Зона" — это ведь понятие широкое. На разломе могут стоять какие-то второстепенные здания, административные постройки, но очень важно, чтобы ни сам реактор, ни хранилище радиоактивных отходов не оказались на нем. Поэтому тут нельзя гадать, тут надо знать абсолютно определенно, где строить и что.*

**— А вам не кажутся более безопасными площадки в Могилевской области? Там нашли меловые породы, но все-таки это не разломы, а более устойчивые пласты?**

*— Нет, не кажутся. Мел — очень коварный грунт. И не только потому, что он мягкий. Я не вижу большой проблемы, если на выбранной площадке имеется просадка грунтов, хотя многие в таких случаях пугают, мол, "реактор сползет в землю". Но мел поддается разжижению водой, часто это происходит неравномерно, а вот неравномерные сдвиги грунтов — это уже опасно.*

*Все три площадки находятся в одинаковой сейсмической зоне. Широко упоминаемые белорусскими специалистами ссылки на то, что Островецкая площадка сейсмична, поскольку находится в зоне, где в начале прошлого века было землетрясение (об этом и "Народная воля" писала), я считаю каким-то нонсенсом. Там не могло быть землетрясение в 6—7 баллов по шкале Рихтера хотя бы потому, что американский сейсмолог Рихтер ввел свою шкалу позже, в — 1935 году, а островецкое землетрясение случилось в 1908-м.*

**— Но так говорят специалисты…**

*— Я часто слышал от специалистов абсолютные глупости. Однажды чиновник, которому я сообщил о разломе, приказал: "Перенесите его на другую сторону дороги..."*

*Впрочем, в данном случае я хотел бы акцентировать внимание на другом: было землетрясение или не было, какое оно было, — это не самое важное. Главная проблема — тщательное изучение площадки, где планируется строительство АЭС, даже если она находится в самой что ни на есть безопасной на первый взгляд зоне.*

*Кстати, я не ожидал, что Александр Лукашенко по такому важному вопросу меня не примет. Мы ведь знакомы с ним, встречались в Казахстане, где я возглавлял объединение белорусов "Бацькаўшчына", я был сенатором верхней палаты казахского парламента нескольких созывов, ректором архитектурно-строительной академии Алма-Аты, наши встречи были очень теплыми. Это сейчас вышел на пенсию и вернулся в родную Беларусь, но ведь знания и опыт никуда не исчезли.*

*Но, к сожалению, президент, судя по всему, даже не читал мое послание. Некий начальник управления его Администрации С.И.Буко ответил мне, что в соответствии со ст.9 Закона Республики Беларусь об обращениях граждан мое письмо переправлено в Совет министров. И дальше оно гуляло все ниже, ниже и ниже. Честно говоря, я этого не понимаю: если уж вопрос строительства АЭС не в компетенции президента, то какие тогда вопросы находятся на его рассмотрении?*

**— Александр Лукашенко не геолог, не тектоник, не строитель и не специалист по инженерно-геологическим исследованиям. Но именно ему предстоит подписать решение о строительстве АЭС и выборе площадки. Если бы все-таки вам дали возможность встретиться с ним, что бы вы сказали? Что бы вы ответили, если бы президент напрямую спросил: "Как не ошибиться в выборе?"**

*— То же, что сказал и вам: "Необходимо тщательное изучение выбранной площадки". Потому что строительство АЭС — это большая ответственность. И объяснил бы, как это надо делать.*

**Елена НОВИКОВА.**

**ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ**

## На пошту!

*Да заканчэння падпіскі на "Народную волю" засталося **2** дні.*

*Лепшы навагодні падарунак для сваякоў, сяброў, саслужыўцаў — аплочаны падпісны квіток на "Народную волю". Хутчэй на пошту!*

**Нагадваем: для індывідуальных падпісчыкаў кошт на месяц — 9500 рублёў, на тры месяцы — 28.500, на паўгода — 57.000 рублёў; для арганізацый, установ, прадпрыемстваў кошт падпіскі на месяц — 15.000 рублёў.**

**Наша мэта — перайсці з цягам часу на 5-разовы выхад газеты ў тыдзень.**

**Вы — з "Народнай воляй", "Народная воля" — з Вамі!**

Ф. РП-1

Министерство связи и информатизации Республики Беларусь

АБОНЕМЕНТ на газету 63 222 (индекс издания)

Народная Воля

(наименование издания) Количество комплектов

на 200 год по месяцам

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Кому ______ (фамилия, имя, отчество)

Куда ______ (адрес)

(почтовый индекс) (город, населенный пункт)

ДОСТАВОЧНАЯ КАРТОЧКА на газету 63 222 (индекс издания)

Народная Воля

(наименование издания)

| Сто-имость | подписки | руб. | Количество комплектов | |
|---|---|---|---|---|
| | переадресовки | руб. | | |

на 200 год по месяцам

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Кому ______ (фамилия, инициалы)

Куда ______ (адрес)

(почтовый индекс) (город, населенный пункт)

СКАНДАЛ

**В предыдущем номере "Народная воля" сообщила об увольнении проректора Европейского гуманитарного университета Владимира Дунаева. Неожиданная информация вызвала широкий резонанс. Многие читатели хотят знать причины ухода из опального вуза такого знакового человека, как профессор Дунаев. Действительно, что произошло в университете, основатели которого всегда вызывали уважение своим единомыслием и солидарностью? Это ротация кадров или раскол в руководстве? По некоторым сведениям, конфликт возник из-за разных взглядов руководства ЕГУ на предложения Евросоюза вернуть университет в Беларусь на законных основаниях.**

**Чтобы не плодить слухи, "Народная воля" решила предоставить слово непосредственным участникам событий.**

*Владимир ДУНАЕВ:*

# «Мне даже не предложили должность преподавателя»

**— Владимир Александрович, на ваш взгляд, в чем причина вашей отставки? Только ли "в целях обновления руководства ЕГУ"? Ректор Анатолий Михайлов говорил о "неблагоприятном повороте событий"...**

— Я даже не смог прочитать сообщение пресс-службы ЕГУ, потому что в тот же день, когда было объявлено о расторжении трудового контракта, меня отключили от интернета и ликвидировали мою учетную запись.

Лично я не получал никаких объяснений. Юридически — это корректно, потому что работодатель, согласно правилам, может прервать контракт в любое время, но при этом компенсировать все финансовые потери. Мне предъявлен именно такой вариант расторжения договора.

Финансово он кажется благоприятным, а во всем остальном является неожиданным. Со мной никто никаких переговоров заранее не вел. То соглашение, которое было представлено в качестве первоначального решения, содержало очень унизительные условия, например, мне пожизненно нельзя было комментировать то, что происходит в университете, отзываться о каких-то лицах — за это полагались огромные штрафы. Но самое главное — мне даже не предложили место преподавателя. Я готов был подписать это унизительное соглашение, если бы мне предоставили возможность продолжить работу в университете. Мне очень сложно представить свою жизнь без ЕГУ.

Но, к сожалению, в конечном варианте соглашения работодатель все равно отказался от моих услуг.



**— Рискну предположить, что все это возникло не на пустом месте?**

— Конечно, не на пустом. У меня есть очень серьезные расхождения с нынешним руководством университета. Меня осуждали за обсуждение темы возможного возвращения ЕГУ в Беларусь. Но я считаю, что обсуждать эти условия надо, и на этом настаивают европейские доноры университета, и Сорос об этом говорит. Мы должны учитывать и взгляды преподавателей, и студентов. Но другое дело, что было бы безумием возвращаться в Беларусь сегодня, потому что для этого нет ни экономических, ни политических, ни легальных предпосылок. Однако я считал вполне уместным обсуждать то, при каких условиях университет мог бы вернуться в Беларусь, каков должен быть план этого возвращения. Но некоторыми руководителями университета эта идея рассматривалась как угроза существования ЕГУ. Но, должен сказать, это не главная причина моего увольнения.

**— А какая главная?**

— Мы по-разному понимаем университетскую автономию, роль академического сообщества университета в решении стратегических вопросов. Но я даже не предполагал, что они настолько разные, что мне не нашлось даже места преподавателя в этом университете. Неужели я стал так опасен для ЕГУ?!. Или есть некие непроясненные мотивы?

**— Ваш план стратегического развития ЕГУ был каким?**

— Я видел возможности значительно большей автономии от доноров в перспективе...

**— В интервью БелаПАН вы сказали, что "система управления вузом требует изменений, демократизации". Если честно, несколько удивило, что в ЕГУ не хватает демократии, всегда казалось, что эти слова почти синонимы...**

— На мой взгляд, конструкция власти в ЕГУ сейчас недостаточно демократична. Возможно, во многом это было обусловлено ситуацией вынужденного перемещения из Беларуси в Литву, создания университета в изгнании.

Для того, чтобы понять положение университета, надо понять, как он управляется с некоторых пор. Фактически с конца 2007 года университетом руководит Управляющий совет и существует трастовый фонд, который аккумулирует средства. Сама по себе эта схема неплоха, но ей, на мой взгляд, не хватало самого главного — реального взаимодействия между академическим сообществом и структурой управления. На мой взгляд, даже то, что было предусмотрено уставом, не использовалось в полной мере университетским сообществом для того, чтобы отстаивать свои права. Возможно, и само академическое сообщество не было готово бороться за то, чтобы с ним считались.

**— Выходит, у вас были единомышленники. Значит ли это, что в преподавательской среде произошел раскол? На ваш взгляд, возможны еще увольнения в ЕГУ?**

— Наверняка моя отставка не последняя. Я думаю, это только начало. Хорошо, если это будет связано только со всякого рода политической или идеологической стратегией развития университета. Но, возможно, будут еще какие-то решения, менее привлекательного рода с точки зрения мотивов. На мой взгляд, сегодня университет переживает тяжелую кризисную ситуацию, но я верю, что академическое сообщество сорганизуется, найдет новые возможности для того, чтобы сохранить и свою репутацию, и принципы академической культуры.

**— А у вас какие планы? Если поступят предложения о трудоустройстве, например, из БГУ или других государственных вузов, примете их?**

— Это что-то из области фантастических сюжетов...

Я должен переварить то, что произошло. До сих пор я не отделяю себя от Европейского гуманитарного университета. На встрече с ректором и руководителями ЕГУ я отметил, что если они не видят возможности использовать меня как преподавателя, я готов даже на безвозмездной основе оказывать любую помощь университету как эксперт, как консультант. Но это предложение также не было поддержано. Никакая материальная компенсация не возместила моих моральных потерь. Я бы не стал держаться за должность первого проекта, я просто хотел бы работать и дальше...

## СПРАВКА «НАРОДНОЙ ВОЛИ»

17 декабря пресс-служба Европейского гуманитарного университета объявила об уходе с поста первого проректора ЕГУ профессора Владимира Дунаева. Ректор и создатель университета Анатолий Михайлов объяснил, что Дунаев уволен в связи "с утверждением Управляющим советом Стратегического плана на 2008—2013 годы" и "в целях обновления руководства ЕГУ". Дунаеву "было предложено покинуть свой пост по соглашению сторон". За его отставку члены Управляющего совета проголосовали единогласно.

Университет предложил бывшему проректору серию компенсаций, среди которых: компенсация годовой заработной платы, выходное пособие, медицинское страхование, взнос в пенсионный фонд, содействие в организации зарубежной стажировки, а также финансовую поддержку консультирования по вопросам трудоустройства.

"Несмотря на такой неблагоприятный поворот событий, мы всегда будем признательны ему за значительный вклад в становление и развитие университета", — подчеркнул Анатолий Михайлов.

Владимир Дунаев — один из основателей ЕГУ. Когда в 2004 году университет был закрыт белорусскими властями и был вынужден "эмигрировать" в Вильнюс, где в 2005 году возобновил свою деятельность, Владимир Дунаев тоже переехал работать в Вильнюс.

9 октября 2008 года Европейский парламент принял резолюцию о ситуации в Беларуси. В документе европарламентарии предложили европейским структурам "призвать правительство Беларуси, в качестве знака доброй воли и позитивных изменений в стране, дать возможность ЕГУ на законных основаниях вернуться в Беларусь из изгнания в Вильнюсе и возобновить свою работу в условиях, позволяющих его дальнейшее развитие в Минске".

*Анатолий МИХАЙЛОВ:*

# «Не хотелось, чтобы эту ситуацию расценивали как некий межличностный кофликт»

— Ситуация в ЕГУ на самом деле не самая простая, — считает ректор ЕГУ Анатолий Михайлов. — Мне бы не хотелось публично это все обсуждать, потому что лично для меня это очень болезненный вопрос.

**— Для многих отставка Дунаева была как гром среди ясного неба, ЕГУ всегда ассоциировался с вашей фамилией и фамилией Дунаева, о вашей солидарности ходили легенды...**

— Одно дело, когда мы начинаем возвещать некие идеалы, другое — когда сами с трудом выдерживаем жизненные вызовы. И не всегда адекватны к этим вызовам. Мы смогли пережить и выстоять такой трудный период, как ликвидацию ЕГУ, его выдворение из Беларуси и создание университета в изгнании. Но оказались не способны выстоять перед рутинными испытаниями.

**— Что конкретно произошло в ЕГУ? По некоторой информации, причина конфликта в том, что вы по-разному смотрите на вопрос возвращения университета в Беларусь...**

— На мой взгляд, со стороны Владимира Александровича на самом деле были некие странные действия. Например, за моей спиной он приглашал собраться для обсуждения вопроса о возвращении ЕГУ из Вильнюса в Минск. Мы с таким трудом выстраиваем этот проект, и тут... Но мне бы ни в коем случае не хотелось, чтобы эту ситуацию расценивали как некий межличностный конфликт.

ЕГУ руководит Управляющий совет, который создан для того, чтобы поддержать университет в долгосрочной перспективе. В состав совета входят известные



ученые Европы и США, руководители известнейших фондов. Плюс ко всему есть учредители, есть взаимодействие со всеми донорами, которые долгое время делали возможным существование нашего проекта и собираются поддерживать ЕГУ и дальше. Уже одобрен пятилетний план сотрудничества, предпринимаются усилия по реформированию управления университетом с целью выживания ЕГУ... У Владимира Александровича возникли противоречия не со мной. Что касается меня, то я считаю, что нельзя связывать университет с именем Михайлова, Дунаева или еще чьим-то. ЕГУ должен существовать как структура. Нужна свежая кровь, новые люди и больше доверия к нашим коллегам, которые могли бы участвовать в проекте. Управляющий Совет и совет учредителей решили, что так дальше нельзя. За отставку Дунаева голосование было единогласным. Если ему выдали заработную плату за год вперед, только чтобы он не работал, представляете, что за этим может стоять...

**— К слову, Владимира Дунаева очень обидело то, что ему даже не предложили должность преподавателя...**

— В ЕГУ нет должностей профессора как таковых. Мы только сейчас приступаем к формированию принципов, по которым будет определен состав нашего преподавательского коллектива. При этом количество преподавателей все равно будет ограничено. И мы бы вполне могли принять помощь от Владимира Александровича. Но сейчас такой вот своей разрушительной деятельностью он уничтожает последние возможности для сотрудничества. Я даже не предполагал, что по отношению к проекту, в который он вложил столько своих сил, можно быть настолько деструктивным и наносить ему ущерб.

**— Эта отставка не приведет к расколу в университете?**

— Есть некоторые болезненные явления, но раскола нет. За последние годы это самое болезненное потрясение, которое пришлось мне пережить. Я готов был сам уйти в отставку. Но Управляющий совет решил так.

**— Анатолий Арсеньевич, если говорить о возможности возвращения ЕГУ в Беларусь, каковы перспективы?**

— Мы приступаем к новым, возможно, болезненным процессам для того, чтобы университет получил новый импульс. К сожалению, то, что сегодня происходит в системе образования Беларуси, не позволяет нам вернуться на родину. В ином случае уникальный проект ЕГУ будет разрушен.

**Мария ЭЙСМОНТ.**

ЧУЛІ?

# Аляксандр Бондар — за кратамі



Арыштаваны былы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта, экс-дырэктар НДІ фізічнай культуры і спорту **Аляксандр БОНДАР**.

*"28 лютага 2008 года выканкам НАК пазбавіў "Прессбол" алімпійскай акрэдытацыі на Гульні ў Пекін з такой фармулёўкай свайго рашэння, што газета стала "друкаваць публікацыі, якія зневажаюць гонар і годнасць алімпійскіх чэмпіёнаў і падрываюць дзелавую рэпутацыю НАК, — нагадала спартыўная газета. — Размова ішла аб артыкуле Святланы Парамыгінай "НИИсследованный миллиард", дзе аўтар расказала аб механізме буйных тэндэрных фінансавых махінацый работнікаў НДІ фізічнай культуры і спорту, які ўзначальваў Аляксандр Бондар. Пазней гэта публікацыя была пакладзена ў аснову афіцыйнай комплекснай праверкі НДІ, якая праводзілася Упраўленнем аховы здароўя, сацыяльнай абароны, спорту і турызму Камітэта дзяржаўнага кантролю. Яе вынікі цалкам пацвердзілі праўдзівасць выкладак журналісткі. У выніку адзін з галоўных персанажаў серыі выкрывальніцкіх матэрыялаў Аляксандр Бондар пазбавіўся пасады дырэктара НДІ, а пасля таго, як матэрыялы праверкі паступілі ў праваахоўныя органы, яшчэ і свабоды. Як стала вядома, зараз Аляксандр Бондар арыштаваны супрацоўнікамі Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі і змешчаны ў следчы ізалятар. На яго маёмасць накладзены арышт".*

Публікацый "па Бондару", як і фактаў, было шмат. Напрыклад, спецыялісты КДК устанавілі, што тэндэры па набыцці дарагога медыцынскага абсталявання яшчэ ў 2001—2002 гадах праводзіліся з сур'ёзнымі парушэннямі. Дамовы куплі-продажу заключаліся раней, чым адбываліся пасяджэнні тэндэрных камісій.

Акрамя таго, сталі вядомы шматлікія фінансавыя парушэнні, якія вылічваліся ў мільёнах рублёў. Грошы так і не вярнуліся ў бюджэт. Згодна з загадам Міністэрства спорту, сумы, якія выкарыстоўваліся не па мэтавым прызначэнні, "у парадку выключэння" былі кампенсаваны з пазабюджэтных сродкаў і не пералічаны ў бюджэт, як патрабуе закон, а пакінуты ў НДІ.

Высветлілася і тое, што ў асобныя месяцы Бондар атрымліваў заробак больш за 20 мільёнаў рублёў!

Цікава, што калі члены выканкама НАК пазбаўлялі "Прессбол" акрэдытацыі, то іх пакрыўдзіла рубрыка "Алімпійская памойка", якая, маўляў, "дыскрэдытуе алімпійскі рух". Факты фінансавых махінацый, як аказалася, нікога не пакрыўдзілі. Не здзівіла, што дзяржаўныя сродкі, якія былі накіраваны на падрыхтоўку да Алімпіяды, зніклі на расійскай "памойцы" — так званай расійскай фірме па адмыванні грошай.

Зрэшты, нягледзячы на шматлікія звароты і самой газеты, і спартсменаў да Аляксандра Лукашэнкі, акрэдытацыю "Прессболу" тады так і не вярнулі. А вось следчыя не пераставалі працаваць.

Следства і суд расставяць кропкі над "і" ў гэтай справе. Але многія ўжо зараз кажуць, што калі суд зробяць закрытым, то грамадскасць можа не даведацца пра вельмі цікавыя факты з "дзейнасці" не толькі былога дырэктара НДІ, але і многіх высокіх спартыўных чыноўнікаў.

**Алесь СВЯТЛАНІЧ.**

ПАЛІТКУХНЯ

## *Аляксандр Казулін выйшаў з партыі*

**У нядзелю адбылося пасяджэнне Цэнтральнага камітэта Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада).**

На пасяджэнні выступіў ганаровы старшыня БСДП Аляксандр Казулін і заявіў аб тым, што выходзіць з партыі і неўзабаве пачне паездкі па краіне.

Аб сваім выхадзе з партыі заявілі таксама Аляксей Кароль і Уладзімір Нісцюк.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

## *«Я за крэсла ніколі не змагаўся»*

"Я за крэсла ніколі не змагаўся. Я прыйшоў у партыю па настойлівай просьбе (мяне прасілі стаць лідэрам партыі, гэта ні для каго не сакрэт), каб ёй дапамагчы. Я прыйшоў і дапамог", — такую заяву, каментуючы свой выхад з Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), зрабіў ганаровы старшыня партыі, экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін.

У найбліжэйшы час палітык мае намер ажыццявіць шэраг паездак у рэгіёны. "Вельмі многія людзі клікалі мяне наведаць рэгіёны, расказаць пра сваё бачанне далейшых перспектыў. Аднак зрабіць гэта раней значыла б стварыць атмасферу падддыванных інтрыг і канфліктаў у партыі, стварыць ўражанне, што я збіраюся змагацца за крэсла, што я збіраюся быць старшынёй партыі. І гэта б унесла дэзарганізацыю ў дзеянні БСДП. Таму цяпер, калі я свабодны ад абавязацельстваў перад партыяй, ад адказнасці лідэра ў партыі, я магу сустракацца з людзьмі і спакойна з імі размаўляць", — сказаў А.Казулін.

На пытанне, ці не збіраецца А.Казулін аднавіць рух "Воля народу", ініцыятарам стварэння якога ён некалі з'яўляўся, палітык адказаў: "Я цяпер збіраюся жыць. Гэтага дастаткова".

## *Памёр Эберхард Хайкен*

У ноч з суботы на нядзелю ў Германіі ад інфаркту на 74-м годзе жыцця памёр Эберхард Хайкен — былы кіраўнік місіі АБСЕ ў Беларусі.

Ён узначальваў місію з пачатку 2003 года да жніўня 2005 года.

## *Міністр Зайчанка заклікае купляць беларускае*

Ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу насельніцтва "павінна думаць, як адмовіцца ад дарагіх імпартных тавараў, накіраваць свае патрэбнасці на айчынныя тавары". Так лічыць міністр эканомікі Мікалай Зайчанка.

Ці гатовы вы, паважаныя чытачы, адмовіцца ад імпартных тавараў і ці сапраўды беларускія тавары танныя?

Чакаем вашых меркаванняў.

ДИКОСТЬ!

# Смертельное воспитание

Вечером 12 декабря, не дожив 19 дней до своего 5-летия, маленькая жительница города Несвижа Анастасия умерла от кровопотери и травматического шока. Жестоко избитая накануне днем собственной матерью, она больше суток пролежала дома и умерла, так и не дождавшись "скорой помощи".

Как сообщил следователь Несвижской районной прокуратуры Алехан ПЕКАРЧИК, на допросе мать маленькой Насти свои действия объяснила тем, что девочка не слушалась, поэтому она и решила ее наказать. Наказывала не только руками, но и палкой. Удары наносила по всему телу, в том числе по голове. Причем, по предварительным данным, женщина была трезвой и на учете в психиатрическом диспансере не состояла.

"Будем отправлять ее на психиатрическую экспертизу в "Новинки", — говорит А.Пекарчик. — Дело в том, что незадолго до этой трагедии, 20 ноября, она родила еще одного ребенка, и, возможно, у нее после родов — психологический стресс или еще что-то подобное. До этого случая женщина нигде на учете не состояла и характеризуется как вполне адекватный человек".

В то же время этот "адекватный человек" не только жестоко избил палкой маленькую дочь, но и пытался всю вину за произошедшее переложить на самого ребенка.



"Первоначально мать убеждала следователей в том, что девочка с лестницы падала, говорила, что дочь последнюю неделю дома не была, а гостила у бабушки в деревне. Естественно, беседы с соседями мгновенно эту версию разрушили. Те показали, что девочка не была в деревне и что мать достаточно часто наказывала ее физически. Потом уже женщина рассказала всю правду. Сейчас она задержана и находится в следственном изоляторе. Ведет себя, мягко сказать, странно. Все время молчит, но и особых сожалений по поводу содеянного не выражает. То ли в себе все держит, то ли вообще не переживает, сказать сложно", — говорит следователь.

Так же сложно понять и то, почему избитому и истекающему кровью ребенку больше суток не оказывали никакой медицинской помощи. Напомним, избила мать девочку 11 декабря днем, а в "скорую помощь" вызов поступил только 12-го вечером. И то только потому, что на этом настоял сосед, которого пригласили осмотреть ребенка.

"Мать говорит, что спрашивала у дочери, как та себя чувствует. Но что может ответить только что избитый ребенок? Естественно, она говорила, что ничего не болит. И только когда ее начало тошнить и она не могла ни встать, ни пошевелиться, родители обратились к соседу, который имеет медицинское образование. Тот, осмотрев ребенка, потребовал вызвать "скорую". Но когда она приехала, было уже поздно", — рассказал А. Пекарчик.

По словам следователя, семья маленькой Анастасии на учете по системе "Быт" не состояла, хотя мать довольно часто била девочку, которая о побоях рассказывала соседям. Но те участковому ничего об этом не сообщали.

В данной ситуации трудно понять и сожителя матери погибшей девочки. Он тоже ничего не предпринял для того, чтобы Насте оказали медицинскую помощь. По словам Алехана Пекарчика, мужчина ограничился вопросом о самочувствии девочки и удовлетворился ее ответом. Хотя поверить в то, что все хорошо и ничего не болит, видя избитое до синевы тело, было, говорит следователь, очень трудно.

Против матери-убийцы прокуратурой района возбуждено уголовное дело по ст.139 ч.2 п.2 УК РБ, предусматривающей наказание от 8 до 25 лет лишения свободы либо исключительную меру наказания. И в этой связи возникает вопрос о судьбе недавно родившегося у женщины второго ребенка. Особенно учитывая то, что она хоть и была замужем, но уже 2 года жила не с законным супругом, а с сожителем. И ребенок, родившийся месяц назад, был от него.

"Второго ребенка хочет забрать сожитель. Сейчас этот вопрос будет решаться через загс. Муж напишет заявление об отказе от ребенка, поскольку тот хоть и родился в браке, но не от него. А сожитель официально признает отцовство. Однако решать, отдавать ребенка ему или назначать опеку, будет отдел образования райисполкома", — говорит следователь.

**Александр КАЗАТЫЙ,** *"Е".*

**ПРАБЛЕМА!**

# Спадарыня Таразевіч, скажыце, калі ласка, чаму з Пастаў з'язджаюць людзі?

Раённы цэнтр Паставы на захадзе Віцебшчыны — самы, бадай, крызісны ў сэнсе беспрацоўя ва ўсёй вобласці. Тады як афіцыйны ўзровень беспрацоўя па краіне складае толькі крыху больш за 1% ад колькасці працаздольнага насельніцтва, у Пастаўскім раёне гэты паказчык сягнуў за 2,4%. Вядома ж, гэтай лічбе верыць нельга. На самай справе беспрацоўе ў некалькі разоў большае.

Не варта лічыць, што згаданая праблема ўзнікла ў апошнія часы. Яна ў Паставах існавала здаўна, проста ніхто не рабіў ніякіх захадаў па яе вырашэнні. А таму з цягам часу яна рабілася ўсё больш вострай.

Асаблівасць нашага райцэнтра ў тым, што тут дзесяцігоддзямі размяшчаліся шматлікія вайсковыя часці, дзе працавала вялікая колькасць насельніцтва. Пасля распаду СССР вайсковыя часці перавялі ў Расію, але сем'і многіх вайскоўцаў засталіся там, дзе жылі, і апынуліся без працы.

Калі беспрацоўе дасягнула крытычных памераў, раённыя ўлады звярнуліся па дапамогу да прэзідэнта. Пасля гэтага працоўных месц пабольшала, але недастаткова. Наогул, мясцовыя чыноўнікі не надаюць праблеме беспрацоўя належнай увагі. Затое яны ахвотна рэкламуюць досвед прыватнай практыкі барацьбы з беспрацоўем і выдаюць яго за свае заслугі.

А досвед такі сапраўды ёсць і памнажаецца з кожным годам. Да прыкладу, двое былых ваенных авіятараў стварылі дрэваапрацоўчае прадпрыемства, на якім сёння працуюць каля тысячы чалавек. Яны вырабляюць выдатную мэблю і прадаюць амаль усю за мяжу, у краіны Еўрасаюза. Вось на гэта прадпрыемства мясцовае начальства і возіць цяпер высокіх гасцей з Віцебска і Мінска, паказваючы гэты аб'ект як уласнае дасягненне. Нават адрамантавалі да яго дарогу, пафарбавалі суседнія дамы і платы навокал.

І смех, і грэх, але менавіта са згадкі пра недзяржаўнае прадпрыемства "Пастаўскі мэблевы цэнтр" звычайна пачынае распровед на тэму змагання з беспрацоўем начальнік аддзела працы і сацыяльнай абароны райвыканкама Алена Таразевіч. Афіцыйныя прагнозы наконт таго, што ў Паставах і ў шэрагу іншых малых гарадоў узровень беспрацоўя да 2010 года зробіцца крытычным, чыноўніца лічыць беспадстаўным перабольшаннем. Уключэнне Пастаў у адмысловую праграму па спрыянні занятасці насельніцтва, на думку А.Таразевіч, адбылося "па інерцыі". Вось як яна сама пра гэта гаворыць:

*— У той час, калі ў нас былі вялікія праблемы, нас уключылі ў гэтую праграму, і мы там застаёмся. А я лічу, што ў раёне не будзе росту беспрацоўя. У нас дастаткова працоўных месц. Возьмем, да прыкладу, наш "Пастаўскі мэблевы цэнтр" — прыватнае прадпрыемства, дзе больш за 700 працаўнікоў, яшчэ каля 100 чалавек навучаем новым спецыяльнасцям з перспектывай працаўладкавання і ствараем каля 500 працоўных месц. Для невялікага мястэчка, якім з'яўляюцца Паставы, гэтага, лічу, дастаткова.*

Такое вось меркаванне чыноўніцы. Зусім іншае гавораць пра ўзровень беспрацоўя мясцовыя жыхары, з якімі я штодня сустракаўся, калі быў кандыдатам у дэпутаты парламента па Пастаўскай акрузе. Людзі распавядалі, што большасць маладых мужчын і хлопцаў з'язджаюць з раёна, каб знайсці сабе працу і зарабіць на жыццё. А ў апошні час у шэрагі беспрацоўных крочылі нават працаўнікі таго самага прыватнага мэблевага прадпрыемства, на якое спасылалася А.Таразевіч, выказваючы ўпэўненасць у тым, што росту беспрацоўя ў Паставах не будзе. Сусветны фінансавы крызіс моцна ўдарыў па краінах Еўрасаюза, і ўскосна гэта адбілася на экспарце пастаўскай мэблі. Збыт яе на Захад скараціўся, і ўладальнікі вымушаны звальняць працаўнікоў.

Што і казаць, становішча ў нас несуцяшальнае. Нешматлікія прадпрыемствы згортваюць свае вытворчыя праграмы, дзесяткі людзей губляюць працу, многія, не задаволеныя малымі заробкамі, з'язджаюць у пошуках лепшай долі ў Расію, Латвію і Літву, дзе працуюць будаўнікамі, шафёрамі, зарабляючы да 1000 долараў у месяц супраць 250—300 тысяч беларускіх рублёў на радзіме. І калі потым сустракаюцца з тымі, хто застаўся і атрымлівае такі мізэр, звычайна пытаюцца здзіўлена: "Хіба можна пражыць на гэтыя грошы?"

Я ўпэўнены, што праблемы беспрацоўя павінны вырашацца з актыўным і адказным удзелам дзяржаўнай улады, як ва ўсім цывілізаваным свеце. Дзяржаўныя праграмы абавязаны забяспечваць не толькі наяўнасць працоўных месц, але і годныя заробкі.

**Уладзімір БРОЎКА,**
**ваенны пенсіянер,**
**былы камандзір авіяпалка з адзінай працоўнай перспектывай — выконваць абавязкі вартаўніка за 200 тысяч рублёў у месяц.**

*г.Паставы.*

**ЧУЖОЙ КОШЕЛЕК**

# Почему грузчик получает больше врача и учителя?

...Во время недавней избирательной кампании, будучи доверенным лицом кандидата в депутаты Татьяны Ваниной, принимал участие в нескольких ее встречах с избирателями. Красной нитью этих встреч проходила тема искаженного нынешней властью государственного бюджета в пользу силовых структур. При этом ответственность за такое положение с распределением наших общих денег несут и депутаты, утверждающие ежегодно бюджет государства. Присутствовавший на одной из встреч милицейский начальник попытался вступить с нами в полемику: дескать, милиции средств самой не хватает, на зарплату в 600 тысяч рублей не хотят идти работать молодые люди. Самое интересное, что нам с Ваниной не пришлось даже вступить в дискуссию, поскольку вставший из зала пожилой человек парировал, что у его дочери, работающей врачом, зарплата — 400 тысяч рублей. После этого наш оппонент сидел молча до самого окончания встречи.

Мне, представителю системы образования, положение с уровнем зарплат в нашей сфере хорошо известно. Сегодня учитель с большим стажем, имеющий высшую категорию, чтобы заработать 900 тысяч рублей в месяц, должен переносить сверхперегрузки, имея 36 учебных часов в неделю. Начинающий преподаватель колледжа получает 200 тысяч, со стажем — 400 тысяч. Зарплата университетского профессора, доктора наук со всеми повышающими коэффициентами не дотягивает до 1,5 миллиона рублей, доцент, кандидат наук получает немногим более 1 миллиона. А вот с заработками медработников я был знаком значительно хуже, поэтому позвонил своему знакомому врачу, работающему в одной из минских клиник. Он работает заведующим отделением, и при стаже более 20 лет его оклад составляет чуть более 600 тысяч рублей.

Недавно мне в руки попалась газета "Работа сегодня", где публикуются вакансии на минском рынке труда. Прелюбопытная информация. Например, разнорабочий (человек, не имеющий никакой квалификации) получает зарплату, начиная от 850 тысяч рублей, грузчик в продовольственном магазине, работающий по графику день через три, может заработать от 900 тысяч до 1,2 миллиона, к тому же ему предоставляется социальный пакет. Геодезист со средним образованием — от 1,4 миллиона. О водителях, операторах станков, строителях и прочих говорить не приходится — ставки начинаются от 1,5 миллиона рублей.

Как говорится, без комментариев...

**Анатолий ПАВЛОВ,**
**кандидат химических наук,**
**экс-проректор БГУ.**

**РЕПЛИКА**

## *Использовали и выбросили*

**Как важно политику всегда оставаться еще и порядочным человеком. В противном случае произойдет то, что произошло с рядом депутатов Палаты представителей предыдущего созыва.**

Использовала их власть, как презервативы (извините за такое сравнение), и выбросила. Я не буду называть конкретные фамилии, все знают в лицо этих "пресмыкающихся деятелей". Особенно запомнился тот, которого власти постоянно использовали во время проведения политических кампаний и который, как попугайчик, все время повторял с экрана парочку заученных демагогических фраз, явно не понимая их значения.

Этот тип, как и ему подобные, думал: за поддакивание власть одарит еще одним сроком в "палатке", а тут... Подошли очередные выборы, а их нет в списке на выдвижение кандидатами в депутаты. Плачь не плачь, а больше ты "хозяину" не нужен. "Хозяин" понимает, что наступают другие времена, нужно избавляться от таких одиозных "помощников", которые своей примитивностью и открытым лизоблюдством могут "всю кашу испортить". И выбросил их, как выбрасывают те же использованные презервативы.

Интересно, как смотрит в глаза жене, детям, знакомым теперь этот "граммофончик", тупость которого написана на лице? Неужели бессовестное поведение оставшихся без портфелей "попугайчиков" не станет уроком для некоторых нынешних горе-депутатов, которые, забыв о порядочности, думают не об интересах народа, а о том, как бы угодить "хозяину"?

**Федор Иванович КУПРИЯНОВ,**
**избиратель.**

**СИТУАЦИЯ**

## *Кто у нас выше грамматики?*

**Попадалась ли вам когда-нибудь на глаза в продуктовом магазине маленькая коробочка молока, на которой изображен веселый мальчуган-школьник, держащий раскрытую тетрадку? Рядом с картинкой — надпись: "Пейте дети молоко". Именно так! Слово "дети" не выделено запятыми, хотя является здесь обращением.**

"Зачем придираться к мелочам!" — воскликнет иной читатель. А вы представьте себе смущение подростка-отличника, приобретающего это молоко для младшего братишки или сестренки. Между прочим, на обеих страницах тетради красуется оценка "10". Кому как, но мне соседство неграмотно написанного предложения с наивысшей школьной оценкой режет глаз.

В прошлом месяце я письменно обратилась по этому вопросу к производителю товара — ОАО "Бабушкина крынка" (г.Могилев). Мягко указав на синтаксическую ошибку, попросила принять соответствующие меры.

На днях получила ответ:

*"Уважаемая Мария Анатольевна, работникам ОАО "Бабушкина крынка" известно, что обращения вместе со всеми относящимися к ним словами выделяются запятыми, но с точки зрения дизайна эти слова являются авторским элементом упаковки. Однако то, что Вы обратили на это внимание, заставило и нас задуматься о внесении соответствующих изменений.*

*Начальник бюро рекламы Н.А. Шабловская"*

В свое время один могущественный властитель, когда ему сделали замечание лингвистического характера, ничтоже сумняшеся заявил: "Я кесарь, и я выше грамматиков!"

Неужели и среди белорусских дизайнеров есть столь же самоуверенные люди?

**Мария БОГДАНОВИЧ.**

Могилев.

**КРЫК ДУШЫ**

# Атрымаць пенсію і не памерці



Я, Паўлаў Сяргей Канстанцінавіч, жыхар вёскі Веляшковічы Лёзненскага раёна Віцебшчыны, нядаўна адзначыў сваё 60-годдзе. Інакш кажучы, дасягнуў пенсійнага ўзросту.

Прызнацца, не разлічваў, што дажыву да гэтага, бо не аднойчы бачыў смерць побач, не раз мог і сам загінуць. Добра ведаю, наколькі тонкая і нетрывалая мяжа аддзяляе жыццё ад смерці. На маіх вачах у жніўні 1968 года, калі я знаходзіўся на тэрміновай службе пад Масквой, паміраў малады хлопец з Украіны Дзмітрый Васіленка, у якога без дай прычыны, па дурасці, стрэліў з карабіна вартавы гаўптвахты. Смяротна паранены Дзімка паміраў, хоць напярэдадні гаварыў, што ўжо хутка яму на "дзембель", збіраўся ажаніцца. Як зараз бачу яго, залітага крывёю, што ў рытме сэрца, штуршкамі, сыходзіла з маладога, моцнага цела. На месцы застрэленага Дзімкі мог апынуцца і сам. А праз колькі год, калі, вярнуўшыся з арміі, я працаваў кіроўцам калгаснага аўтобуса і ехаў у бок Гомеля, мяне абагнала "Волга". Праз хвілін 30, даехаўшы да Буда-Кашалёўскага скрыжавання, убачыў я тую ж "Волгу", ушчэнт разбітую, а ў ёй — тры трупы. З гадзіну, калі не больш, я не мог апрытомнець ад убачанага, мяне біў калатун, ад чаго машына мая рухалася рыўкамі.

Пасля гэтага ўражання я прасіў Бога толькі аб адным: "Блаславі мяне і ўратуй на сённяшні дзень!" Так гаварыў я, звяртаючыся да Госпада ў думках шторанак і трымаў хуткасць машыны не вышэй за 60 кіламетраў у гадзіну.

І вось трымаю ў руках навюткае пенсіённае пасведчанне №361544-25, пасведчанне "Ветэрана працы" і працоўную кніжку з адзнакамі аб амаль 40-гадовым стажы і шматлікімі заахвочваннямі, а потым пераводжу вочы на суму пенсіі, прынесенай паштальёнкай. Сума гэтая складае 261 тысячу рублёў! Хочацца паставіць пытанне перад усімі, хто можа і хоча паслухаць: "Шаноўныя землякі-беларусы, падкажыце, як пражыць на гэтыя грошы?"

Атрымаўшы такую пенсію і паразважаўшы пра яе, я міжволі прыгадаў тое, што пачуў у 1969 годзе ад найстарэйшай з жанчын нашай вёскі, 90-гадовай Акуліны Змуленка: "Мы жывём у бандыцкай краіне". Так сказала бабуля, і я, пачуўшы гэта, крыху нават сумеўся, бо школа выхоўвала ў мяне зусім іншыя погляды. Але старая адразу ж патлумачыла, што мела на ўвазе. Яе муж, Іван Змуленка, загінуў на германскім фронце ў 1914 годзе, і расійскі цар Мікалай ІІ паклаў удаве салдата пенсію ў 5 рублёў золатам у месяц на дваіх дзяцей. За гэтыя грошы тады, паводле слоў Акуліны, можна было набыць дзвюх кароў. А ў 1969 годзе, калі мы размаўлялі, састарэлая калгасніца атрымлівала ад савецкай улады пенсію памерам у 12 рублёў, на якія можна было купіць 4 бутэлькі гарэлкі па 2 рублі 87 капеек або крыху больш за 5 кілаграмаў сала па 2 рублі 10 капеек за кіло. Гэтыя лічбы мая суразмоўца прывяла, каб патлумачыць, чаму назвала дзяржаву "бандыцкай".

І вось цяпер, узгадаўшы гэтую размову, я лаўлю сябе на думцы, што характарыстыка, дадзеная бабуляй Акулінай у 1969 годзе, застаецца актуальнай і сёння. Хіба ж не па-бандыцку абышлася са мной дзяржава, адкінуўшы ў бок тое, што выпала на маю долю ў СССР, калі ў 1967 годзе я быў прызваны ў Савецкую Армію і спярша служыў у войсках супрацьпаветранай абароны ў Казахстане? Здарылася так, што разам са мной былі прызваныя і служылі ў адным месцы трое маіх аднавяскоўцаў і аднакласнікаў. На вучэбныя пускі ракет нас вазілі ў голы стэп. Тады паліва ракетнае было вадкім, і ў яго склад уваходзіў гептыл — таксічная прысадка, вельмі небяспечная для здароўя чалавека. Больш за іншых пацярпеў ад гептылу мой аднагодак і аднавясковец Жорка Друнчанка, якому даводзілася чысціць пускавыя ўстаноўкі наждачнай паперай ад нагару, пакінутага ракетным палівам. Георгій Друнчанка пасля арміі цяжка хварэў і памёр у 38 год.

Яшчэ адзін мой аднакласнік, Генадзь Шавілаў, жыве на радзіме, у нашых Веляшковічах, але яму не пазайздросціш. Ён, можна лічыць, зажыва гніе, не можа хадзіць з-за гангрэны ног.

У выніку атручвання ракетным палівам пачаў хварэць і я. Нясцерпна балелі суставы, і аднойчы, недзе ў 2007 годзе, пасля наведвання Віцебскага абласнога дыягнастычнага цэнтра мне вызначылі дыягназ — рэўматоідны артрыт. Выпісалі бясплатныя лекавыя прэпараты, якія мне пашчасціла атрымліваць толькі адзін месяц, бо тут якраз адбылася адмена льгот паводле прапановы нашага ўрада разам з дэпутатамі парламента і прэзідэнтам. З таго часу лячыцца ад болю ў суставах мне даводзіцца за ўласны кошт.

Пра тое, каб атрымаць групу інваліднасці, я і не мару, бо ў нас яе вызначаюць хіба што паўмёртваму. Кажу гэта з веданнем справы, маючы перад вачыма шмат прыкладаў, у тым ліку — сваю жонку, Ларысу Пятроўну Паўлаву. Яна большую частку жыцця адпрацавала настаўніцай і завучам школы, але пенсію атрымлівае не нашмат большую за маю. Аднойчы яна ратавала хлопчыка, які дакрануўся да высакавольтнага дроту пад напружаннем і пачаў трэсціся. Каб ён не загінуў, мая жонка кінулася адрываць яго ад дроту і сама атрымала ўдар токам. Атрымала такі ўдар, ад якога траўміраваўся пазваночнік. Дзякуй Богу і тагачаснай медыцыне, выжыла і нават захавала здольнасць рухацца, але пасля таго ў яе ўтварылася шмат розных ускладненняў і хвароб. Заўважу, што ніхто з нашых урачоў не прапанаваў ёй прайсці камісію для вызначэння інваліднасці. Мяркуючы па ўсім, наша медыцына не проста зацікаўлена ў тым, каб інвалідаў не рабілася больш, а строга папярэджаная аб гэтым сваімі начальнікамі ў галіновым міністэрстве, а яно ў сваю чаргу папярэджана аб тым жа ўрадам. Вось чаму я нават не хачу спрабаваць дамагацца прысваення групы, якая дае права на льготныя лекі, хоць і ўпэўнены, што мая хвароба адпавядае як мінімум ІІ групе інваліднасці.

Каб хоць неяк падтрымліваць арганізм і змагацца з болем, патрэбны дарагія прэпараты, а на тую пенсію, што налічылі мне, за коштамі на лекі не ўгонішся.

Нехта з чытачоў можа сказаць, што пенсія ў мяне малая таму, што я мала зарабляў.

Я ніколі не быў лайдаком, заўсёды імкнуўся да годнага заробку, каб забяспечыць сям'ю. І зарабляў нядрэнна, калі працаваў на калгасным трактары. На пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя за два выхадныя дні зарабіў, помню, 60 рублёў. Тады гэта былі сур'ёзныя грошы. Але неўзабаве паводле рашэння калгаснага кіраўніцтва мяне прымусова перавялі на аўтобус і заробкі мае скараціліся да смешнага памеру. А следам разваліўся СССР, калгас збяднеў да поўнай галоты, і я трапіў у беспрацоўныя. Каб зарабіць на хлеб, пагадзіўся на прапанову дырэктара нашай школы ўладкавацца кіроўцам школьнага аўтобуса. Было гэта ў 2000 годзе. 8 год запар вазіў я дзяцей з вёсак нашага сельсавета ў школу і са школы па хатах. За гэты час мая зарплата пакрысе расла і вырасла аж да 170 тысяч. Праўда, у апошні раз, перад самай пенсіяй, з усімі надбаўкамі, уключаючы прэміяльныя, атрымаў я 300 тысяч. Ды толькі на памеры пенсіі гэта падвышэнне, як відаць, не адбілася.

Сёння, узважаючы ўсе свае ўспаміны, я мушу паўтараць, што пачуў 70 год таму з вуснаў 90-гадовай зямлячкі Акуліны Змуленка: "Мы жывём у бандыцкай краіне!"

Савецкая дзяржава абрабавала мяне, скарыстаўшы моц і здароўе, пазбавіўшы магчымасці працаваць адпаведна прафесіі за годную зарплату. Суверэнная беларуская дзяржава, аб'явіўшы сябе нашчадкам і правапераемніцай маёмасці СССР на сваёй тэрыторыі, гэтак жа грэбуе інтарэсамі і патрэбамі шараговых грамадзян і не хоча браць на сябе адказнасць за камуністычныя грахі, хоць улада ў сённяшняй Беларусі так або інакш выказвае сваю вернасць запаветам Леніна—Сталіна.

У час апошніх парламенцкіх выбараў па нашай акрузе балатаваўся ў Палату прадстаўнікоў нехта Аляксандр Папкоў з Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Я трохі здзівіўся, вычытаўшы ў яго агітацыйным плакаце, што ягоны гадавы даход за 2007 год склаў каля 53 мільёнаў рублёў. Я мысленна падлічыў, што гэтая сума перавышае маю за той жа год прыкладна ў 25 разоў. Разумею, што Папкоў — супрацоўнік Адміністрацыі прэзідэнта, а я — толькі шафёр, але сумняваюся, што "нажніцы" паміж зарплатай дзяржаўнага чыноўніка і рабочага павінны быць такімі вялікімі. Ёсць у гэтым нейкая сацыяльная несправядлівасць. Тым не менш і такога даходу Аляксандру Андрэевічу Папкову аказалася, пэўна, малавата, і ён падаўся ў парламентарыі, дзе, кажуць, заробак вялікі, а тыя дэпутаты, якія сыходзяць адтуль на пенсію, атрымліваюць яе ў памеры каля двух з паловай мільёнаў рублёў.

Ну хіба ж не на літару "б" трэба называць паводзіны людзей ад улады, якія, выступаючы перад народам, заклікаюць да ашчаднасці ва ўмовах эканамічных цяжкасцяў, а самі дбаюць найперш пра свае асабістыя даброты?

Пра іх яны клапаціліся, рухаючыся ўверх па кар'ернай лесвіцы, пра гэта будуць рупіцца, калі, седзячы ў парламенце, пачнуць галасаваць за чарговы антынародны закон кшталту адмены льгот у пенсіянераў ды іншых людзей, каму гэтыя льготы даставаліся потам, крывёю і стратай здароўя.

Калі чую па тэлебачанні і радыё альбо чытаю ў казённых газетах, якая ў нашай краіне сярэдняя зарплата, пераконваюся, што высокапастаўленыя халуі, гатовыя за вялікія грошы на ўсё, як прадажныя дзеўкі, не гавораць прэзідэнту праўду пра жыццё народа і настрой беларусаў. Магчыма, Аляксандр Рыгоравіч не ведае, якія аклады ў многіх чыноўнікаў у той час, калі на ўсіх узроўнях улады ідзе гаворка пра эканомію і ашчаднасць ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу. Напэўна, прэзідэнт не ведае і пра тое, што сёння гаворыць паміж сабой ягоны галоўны электарат — пажылыя людзі, якія заўсёды падтрымлівалі А.Лукашэнку.

Апошнія гады шмат змянілі ў настроі людзей, у тым ліку — старых. Большасць з іх цяпер крытыкуе прэзідэнта. Мне часцяком даводзіцца бываць у бальнічных палатах і чуць, пра што гавораць пенсіянеры. Калі б прэзідэнт тое пачуў, ён бы, мяркую, адмяніў бы шэраг законаў і выдаў бы новыя, каб зрабіць лягчэй жыццё пажылых людзей.

Заканчваючы ліст у газету, я хачу звярнуцца да прэзідэнта як гаранта Канстытуцыі, а значыцца — і майго права на годнае жыццё — з пытаннем: як пражыць у сучаснай Беларусі на пенсію ў 261 тысячу рублёў, выкройваючы з гэтай сумы грошы на лекі, іншыя патрэбы?

Ці справядліва гэта, спадар прэзідэнт?

**Сяргей ПАЎЛАЎ,**
**пенсіянер-пачатковец,**
**былы шафёр школьнага аўтобуса вёскі Веляшковічы Лёзненскага раёна.**

**ПОСТАЦІ**

## *Пётр Сяўрук верыў: небыцця не існуе*

**"...Чалавек фармату Пятра Сеўрука — гэта рэдкасць у гісторыі беларускага руху..."**
**"Пётр Сяўрук заслугоўвае сёння памяці як адзін з начальнікаў сучаснай беларускай ідэі нацыянальнай незалежнасці".**

Такую ацэнку далі пісьменніку, публіцысту, філосафу, грамадскаму дзеячу прафесары Беластоцкага ўніверсітэта Яўген Міраповіч і Варшаўскага — Ежы Тамашэўскі. Іх артыкулы — уступныя ў кнізе твораў Пятра Сеўрука "**НЕБЫЦЦЯ НЕ ІСНУЕ**". Гродзенскія гісторыкі Сяргей Токць і Андрэй Вашкевіч у сваіх артыкулах расказалі пра беларускі нацыянальны рух на Скідзельшчыне і жыццёвую дарогу Пятра Сеўрука.

На жаль, ягоная дарога аказалася вельмі кароткай. Нарадзіўся ў Скідзелі ў 1905 годзе, памёр у 1929-м... Але і за такі кароткі час паспеў зрабіць шмат. Укладальнікі кнігі С.Токць і А.Вашкевіч пастараліся ўсебакова прадставіць яго творчасць. Найбольш характэрныя творы апублікаваны ў раздзелах "Публіцыстыка", "Філасофскія разважанні П.Сеўрука", "Паэзія", "Проза", "Ліставанне", "Урыўкі з дзённіка". У артыкуле "І не згарэлі, і сёння патрэбныя" я расказаў пра свайго дзядзьку (П.Сяўрук — родны брат маёй маці), пра вяртанне яго з небыцця, чаму вельмі паспрыяў Янка Брыль.

Пётр Сяўрук быў чалавекам арыгінальным. Маючы за плячыма некалькі класаў гімназіі ў Ліпецку, дзе з бацькамі быў у бежанстве, ён, дзякуючы сваёй настойлівасці, працавітасці, празе да ведаў і немалым здольнасцям, дамогся вельмі многага. Як зазначыў Ежы Тамашэўскі, "ніводная з яго думак не страціла актуальнасці і сёння".

Кніжка "Небыцця не існуе", прэзентацыя якой адбылася днямі ў Гродне, багатая на ілюстрацыі тых далёкіх ужо гадоў. Амаль усе яны унікальныя. Адзін з фотаздымкаў прапануем вашай увазе. Зроблены ён 12 ліпеня 1928 года. У верхнім радзе другі злева — **Пётр Сяўрук**, у ніжнім другі злева — паэт **Міхась Васілёк**, у сярэднім трэці злева — выдавец і рэдактар "Нашай Нівы" **Аляксандр Уласаў**, чацвёрты — **Рыгор Шырма**, пазней народны артыст СССР. Здымак зроблены ў час акруговага з'езду Таварыства беларускай школы, на ім Пётр Сяўрук быў абраны старшынёй Гродзенскай акруговай управы ТБШ.

Выдадзена кніжка "Небыцця не існуе" ў серыі "Гарадзенская бібліятэка" пад патранатам Аляксандра Мілінкевіча, лідэра руху "За Свабоду". Першай была "Магдэбургская Гародня" Юры Гардзеева. Пабачыла свет "Хадзі на мой голас" Дануты Бічэль, рыхтуецца "Развітанне з ілюзіямі" Аляксея Карпюка...

**Мікалай ДЗЕЛЯНКОЎСКІ.**



**Удзельнікі акруговага з'езду ТБШ у Гародні. 12 ліпеня 1928 г.**
**У першым радзе другі злева — паэт Міхась Васілёк (сапр. Міхал Касцевіч), У другім радзе трэці злева Аляксандр Уласаў, чацвёты злева — Рыгор Шырма. У трэцім радзе другі злева Пётр Сяўрук, чацвёртая злева — сястра Пятра Вольга Сяўрук.**

**ПОСТАЦІ**

# «Ёсць у мяне зямля, край светлых мрояў...»

## *24 снежня — 210-я ўгодкі народзінаў генія паэзіі Адама Міцкевіча*



Пачну з кур'ёзу. Пасля святкавання чарговай круглай даты Адама Міцкевіча на яго радзіме адна з беларускіх газет паведамляла, што "з Варшавы ў Наваградак прыехалі польскія госці — землякі паэта".

Што тут скажаш — ну і "логіка": раз Адама Міцкевіча называюць "польскім паэтам", то, выходзіць, нібыта яго землякі — палякі, а не беларусы. Хоць усім вядома, што Адам Міцкевіч — сын беларускай зямлі. Яго "малая радзіма", дзе ён першы раз пабачыў свет, — Наваградчына (былая Гродзенская губерня). З беларусаў, ад далёкага продка Міцькі, паходзіць увесь род Міцкевічаў. На Беларусі нарадзіліся і да канца дзён сваіх жылі бацькі паэта — маці Барбара з Маеўскіх (вёска Чамброва на Наваградчыне) і бацька Мікалай Міцкевіч, наваградскі адвакат.

Часам пытаюцца: як жа ўсё-такі называць Адама Міцкевіча — польскім ці беларускім паэтам? Не ведаю, ці можна тут даць адназначны адказ. І ўвогуле, ці трэба так ставіць пытанне? Але раз яно ставіцца, давайце спакойна (талерантна!) памяркуем.

Калі браць за крытэрый мову, то, без сумнення, Адам Міцкевіч — паэт польскі. Бо пісаў па-польску. У гісторыі польскай літаратуры яму належыць ганаровае месца пачынальніка новага, больш прагрэсіўнага ў параўнанні з класіцызмам, літаратурнага напрамку — рамантызму. Яго творчасць увайшла ў залаты фонд польскай літаратуры.

Разам з тым Адам Міцкевіч не чужак жа і нам, беларусам. Уся яго творчасць звязана з роднай беларускай зямлёй. У яго кнігах ва ўсёй веліччы адбіліся самыя розныя бакі жыцця беларускага народа першай паловы XIX стагоддзя, яго побыт і традыцыі. Усе рэаліі творчасці паэта — беларускія. Перагартайце старонкі яго твораў, у іх так і стракацяць назвы беларускіх гарадоў, мястэчак, вёсак, лясоў, рэк, азёраў: Наваградак, Вільня, Мір, Мінск, Вілейка, Ашмяны, Ляхавічы, Сталовічы, Шчорсы, Рута, Туганавічы, Цырын, Плужыны, Асташын, Варонча, Мыш, Налібакі, Свіцязь, Нёман, Вілія, Прыпяць і г.д. і г.д.

Ужо ў першым сваім зборніку "Паэзія", які выйшаў у 1822 годзе, Адам Міцкевіч ясна паказаў, адкуль родам яго муза. Змешчаныя там балады і рамансы, якія сталі жамчужынамі сусветнай літаратуры, былі напісаны на аснове беларускіх народных паданняў і песень, у іх раскрываюцца вобразы беларусаў. Ды і вершы Адама Міцкевіча розных гадоў — гэта пераважна паэтычны водгук на падзеі грамадскага жыцця Беларусі, многія з іх непасрэдна прысвячаліся сябрам — Яну Чачоту, Тамашу Зану, Адаму Сузіну, Аляксандру Ходзьку і іншым знаным людзям.

Вельмі цікавіла Адама Міцкевіча гістарычнае мінулае Беларусі, асабліва часы Вялікага княства Літоўскага. Розным момантам нашай гісторыі прысвечаны ўсе чатыры буйныя творы паэта — "Мешка, князь Наваградка", "Гражына", "Конрад Валенрод" і "Пан Тадэвуш" ("Апошні наезд на Літве"). Так цікава, у жывых каларытных вобразах беларускае мінулае яшчэ ніхто не раскрываў. Нездарма Міцкевіча сучаснікі называлі "літоўскім Вальтэрам Скотам". Дарэчы, калі я працаваў у выдавецтве "Беллітфонд", мы планавалі выданне гэтых твораў паэта ў кніжнай серыі "Беларускі гістарычны раман".

Патрыятычныя матывы ў творчасці Адама Міцкевіча з асаблівай сілай загучалі, калі за ўдзел ў антыцарскім згуртаванні беларускай моладзі "Таварыства філаматаў" царскія ўлады асудзілі паэта разам з яго сябрамі на выгнанне з роднай зямлі, і ён назаўсёды стаў эмігрантам, пасяліўшыся пасля доўгіх вандраванняў у Парыжы.

Усе гады эміграцыі яго не адпускала нязбытная туга па радзіме, дзе прайшлі самыя першыя і лепшыя гады, дзе засталіся родныя і блізкія, засталося яго вялікае каханне. Гэтую тугу праз многа гадоў пасля выгнання выказаў ён у адным сваім вельмі пранізлівым вершы:

*Калі я, труп жывы, з ашклелым вокам*
*Сяджу між вас, у гэты час блукае*
*Душа мая далёка, ах, далёка*
*І наракае ўсё, ах, наракае.*

*Ёсць у мяне зямля, край светлых мрояў,*
*Мілейшага мне не знайсці другога.*
*Мне ўсе радня там — болей, чым крывёю,*
*Там сэрцу гэтак многа дарагога!*

*Туды штоміг — хай праца ці забавы —*
*Ўцякаю я. Сяджу там пад дубамі,*
*Як некалі, кладуся ў краскі, ў травы,*
*Ганяюся ізноў за матылямі.*

*Там бачу ў белым зноў яе скрозь далі:*
*Бяжыць у лес яна да нас ад ганка,*
*Ляціць праз поле — тоне ў жытняй хвалі,*
*З-за гор далёкай свеціць мне заранкай.*

*(Тут і далей творы паэта падаюцца ў маім перакладзе.)*

Тая, што свяціла паэту "заранкай", была Марыля Верашчака, беларуская шляхцянка, якую ён яшчэ студэнтам пакахаў з першай сустрэчы ў Туганавічах. Ёй прысвяціў Адам Міцкевіч многія вершы і самыя лепшыя старонкі драматычнай паэмы "Дзяды".

Апынуўшыся пасля ўцёкаў з царскай Расіі ў швейцарскіх Альпах, першы напісаны там верш ён таксама прысвяціў ёй:

*Ніколі на свеце мне ўжо*
*не расстацца з табою!*
*На моры, за морам —*
*ты ўсюды, ты ўсюды са мною!..*
*На небе замглёным*
*шукаю палярную зорку,*
*Шукаю Літву маю,*
*дом твой, цябе на падворку...*

Марыля была для Адама Міцкевіча сімвалам страчанай радзімы. Гэта яна вадзіла пяром паэта, калі ён пісаў у Парыжы "Пана Тадэвуша", паэму, якая стала шэдэўрам сусветнай літаратуры.

Працуючы над сваім галоўным творам, Адам Міцкевіч у думках зноў вярнуўся на радзіму, у сваё юнацтва. У пісьме да сябра Антонія Адынца прызнаваўся: "Пішу сваю паэму... Я ізноў жыву ў Літве, у яе лясах, у корчмах... Рэдка куды выходжу... Калі б не паэма, я ўцёк бы з Парыжа".

У гэтай паэме-эпапеі, як жывыя, устаюць перад намі вобразы Беларусі, яе прырода і людзі. "Пан Тадэвуш" — гэта велічны гімн роднай зямлі, яе першародным пушчам і затуманеным палеткам, расквечаным лугам і салаўіным рэкам. Прызнаннем бязмежнай любові да сваёй Бацькаўшчыны і пачынаецца паэма:

*Літва! Мая Айчына! Ты — нібы здароўе:*
*Цябе той цэніць, хто ўжо страціў.*
*Зноў і зноў я*
*Табою мрою, зноў ты ў снах перад вачыма,*
*Вярнуць цябе хачу я ў слове хоць,*
*радзіма...*

Як бачым, сваёй радзімай Адам Міцкевіч лічыў Беларусь, якую тады называлі Літвою і якую апяваў паэт. "Певцом Литвы" называў яго і Аляксандр Пушкін ("Сонет"). Згадваючы падарожжа Адама Міцкевіча па Крыме, вялікі рускі паэт у дадатку да "Яўгенія Анегіна" заўважыў галоўны матыў крымскіх санетаў ды і іншых твораў свайго беларускага сябра:

*Там пел Мицкевич вдохновенный*
*И посреди прибрежных скал*
*Свою Литву воспоминал.*

Тут можа паўстаць пытанне: чаму вялікі патрыёт Беларусі Адам Міцкевіч пісаў свае творы не па-беларуску? Прычына вельмі простая: занадта цесная інтэграцыя з палякамі ў XVI—XVIII стагоддзях, калі наша сярэднявечная дзяржава Вялікае княства Літоўскае дзеля абароны ад маскоўскай агрэсіі аб'ядналася з суседняй Польшчай, утварыўшы федэратыўную саюзную дзяржаву Рэч Паспалітую з цэнтрам у Варшаве, прывяла да таго, што паступова беларуская мова была выцеснена з грамадскага ўжытку, а мовай пісьменства і справаводства стала польская. На ёй выходзілі газеты і часопісы, выдаваліся кнігі, ставіліся спектаклі (у тым ліку і ў Мінску). Пісаць па-беларуску азначала ў тыя часы пісаць "у стол", кажучы сённяшняй мовай. А Міцкевіч жа імкнуўся несці свае думкі, свае ідэі ў шырокія грамадскія колы. За вяртанне беларускай мове яе колішняга статусу дзяржаўнай, як гэта было ў час поўнай самастойнасці ВКЛ, яшчэ трэба было змагацца. Якраз гэта і рабіла створанае Адамам Міцкевічам з сябрамі "Таварыства філаматаў" (прыхільнікаў навук).

Ён любіў і шанаваў мову роднага краю. У адной з лекцый, якія чытаў у Калеж дэ Франс (Парыж), так казаў пра яе: "На беларускай мове, якую называюць русінскай або літоўска-русінскай, размаўляе каля дзесяці мільёнаў чалавек; гэта самая багатая і чыстая гаворка, яна ўзнікла даўно і цудоўна распрацавана. У перыяд незалежнасці Літвы вялікія князі карысталіся ёю ў сваёй дыпламатычнай перапісцы".

Калі мець на ўвазе стаўленне Адама Міцкевіча да нашага народа, да яго культуры і мовы, то ёсць усе падставы сцвердзіць, што пісаў ён вершаваныя творы і па-беларуску. Гэтак мяркуе і прафесар Адам Мальдзіс ("Малая", "сярэдняя" і "вялікая" радзімы Адама Міцкевіча). На жаль, гэтыя творы з розных прычын да нас не дайшлі. Не так даўно я чуў паведамленне, што недзе ў Польшчы былі знойдзены, але потым чамусьці згубіліся беларускія вершы Адама Міцкевіча.

Але яго беларускасць усё роўна, як бы каму гэтага ні хацелася, будзе выяўляцца ў Міцкевічавых творах. Хоць бы ў выглядзе шматлікіх беларусізмаў, якія ў польскіх выданнях тлумачаць у каментарыях як "правінцыялізмы". Па сутнасці, густа насычаная беларусізмамі мова твораў Адама Міцкевіча — гэта мова беларускай апалячанай шляхты XIX стагоддзя, рэгіянальная літаратурная мова "ўсходніх крэсаў", якую польскія літаратурныя крытыкі пагардліва называлі "смаргоншчынай", прымаючы яе ў штыкі. "Вы для Літвы, а не для Кароны пішаце, — наракалі яны на "літоўскіх" пісьменнікаў, — менш дбаеце пра тое, ці вас у Варшаве будуць разумець, абы ў Вільні ды ў Літве вас разумелі" (цыт. паводле кнігі Сымона Брагі "Міцькевіч і беларуская плынь у польскае літаратуры". Нью-Ёрк, 1957). Абараняючыся ад падобных нападак, ад абвінавачанняў у шырокім выкарыстанні беларусізмаў, Адам Міцкевіч пісаў у 1828 годзе ў артыкуле "Пра варшаўскіх крытыкаў і рэцэнзентаў": "...абвінавачвалі мяне, галоўным чынам, у псаванні польскага стылю выкарыстаннем правінцыялізмаў і замежных выразаў. Прызнаюся, што я не толькі не асцерагаюся правінцыялізмаў, але, можа, свядома іх ужываю".

Аднаго разу мне пазванілі з рэдакцыі БелСЭ: як правільна называць Адама Міцкевіча, якое даць яму вызначэнне? Нічога канкрэтнага я тады не змог адказаць. І от цяпер разважаю. Нягледзячы на ўсё тут сказанае, мушу паўтарыцца, што палякі не без падставы называюць яго польскім паэтам. Са свайго боку, мы, беларусы, таксама зрабілі б вельмі правільна, калі б, у згодзе з логікай, назвалі Адама Міцкевіча так: беларускі польскамоўны паэт. І для палякаў, і для беларусаў ён — свой. І дзяліць яго нам няма ніякай патрэбы. Мы аднолькава ганарымся геніем сусветнай літаратуры Адамам Міцкевічам. Яго імя павінна не раз'ядноўваць, а, наадварот, збліжаць нас, народы-суседзі.

Аб гэтым думалася мне, калі я працаваў над выданнем тома "Выбраных твораў" паэта ў серыі "Беларускі кнігазбор".

**Кастусь ЦВІРКА.**

# Сляза Вялікага Адама

*Памяці А.Міцкевіча*

*Між тых палёў сцяжынка ў жыце...*
*Пад пракаветнымі дубамі —*
*Расінка долаў нашых, Свіцязь,*
*Сляза Вялікага Адама.*

*Яна, крыштальная, упала,*
*Як травы з небам гаманілі*
*У летнюю ноч на Ян-Купалу —*
*А па каханай, па Марылі...*

*І ў люстры возера скрозь ночы*
*Не зоры зіхацяць да ранку,*
*А свецяцца Адама вочы,*
*Яго чароўнай Свіцязянкі.*

*Завоссе, Наваградак, Шчорсы,*
*Варонча, Камень Філарэтаў...*
*Праз два стагоддзі незарослы*
*На сцежках тых сляды Паэта.*

*Блукаю берагам прывольскім,*
*І ў шэпце дрэў пад хваляў плюскат*
*Адамаў чую голас польскі —*
*З тугою шчырай беларускай.*

*Амыў ён тут вадой павекі —*
*Самгне іх доля на чужыне —*
*І песню праспяваў навекі*
*Па Літве роднай, па Айчыне...*

**Пятро ЛІПАЙ.**

**P.S.** *На гэты верш Пятро Ліпая вядомы беларускі кампазітар Эміль Наско напісаў песню, якую выконвае Нацыянальны акадэмічны народны хор імя Г.І.Цітовіча.*

*Кампазітар, народны артыст Беларусі Леанід Захлеўны напісаў на гэты ж верш раманс, які ўпершыню выканаў заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Віктар Скарабагатаў. Абедзве песні нярэдка гучаць у канцэртах і на Белдзяржтэлерадыё.*

**ПРАТЭСТ**

## *Баранавіцкія прадпрымальнікі маюць намер пачаць з новага года бестэрміновую забастоўку*

**Каля чатырохсот індывідуальных прадпрымальнікаў горада Баранавічы (Брэсцкая вобласць) маюць намер з новага года пачаць бестэрміновую забастоўку без выплаты падаткаў і арэнды за працоўныя месцы, калі ўлады не прадоўжаць для ІП ільготны рэжым увозу тавараў. Пра гэта БелаПАН паведаміў член аргкамітэта па стварэнні грамадскага аб'яднання "За свабоднае развіццё прадпрымальніцтва" па Брэсцкай вобласці Мікалай Чарнавус.**

Прадпрымальнікі прынялі рашэнне скласці рэзалюцыю з патрабаваннем прадоўжыць для ІП ільготны рэжым увозу тавараў і накіраваць яе прэзідэнту. "Калі нашы патрабаванні не будуць выкананы да апошняга дня выплаты падаткаў (28 снежня), мы з 1 студзеня пачнём бестэрміновую забастоўку без выплаты падаткаў і арэнды за працоўныя месцы", — падкрэсліў М.Чарнавус.

Нагадаем, 1 студзеня спыняецца дзеянне пункта 3 указа прэзідэнта №285 "Аб некаторых мерах па рэгуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці", у адпаведнасці з якім ІП — плацельшчыкі адзінага падатку могуць не прадастаўляць дакументы на ўвезены імі тавар з Расіі і выплачваюць увазны ПДК у фіксаванай суме.

**Наталля КАРОТКАЯ.**

**УВАГА!**

## *За выкарыстанне петардаў у грамадскіх месцах пакараюць мільённым штрафам*

**Несанкцыянаванае выкарыстанне петардаў у грамадскіх месцах сталічная міліцыя расцэньвае як праяўленне дробнага хуліганства.**

Парушальнікаў будуць караць штрафам у памеры ад 70 тысяч да 1 млн 50 тысяч рублёў альбо адміністрацыйным арыштам тэрмінам да 15 сутак.

Аднак, як адзначае БЕЛТА, міліцыянты практыкуюць "індывідуальны падыход" да такіх хуліганаў. Таму нават штрафы пагражаюць не ўсім — некаторых адпусцяць пасля прафілактычнай гутаркі.

**ПО ВАШЕЙ ПРОСЬБЕ**

**В конце прошлой недели смотрел интервью Александра Лукашенко ведущим государственным СМИ. Глядя на Зимовского, Киселя и Козиятко, почему-то вспомнил "телевизионщика" Рыбакова, из-за которого когда-то пострадала и "Народная воля". Где он теперь? Еще сидит в тюрьме? Или уже дома? А может, опять пригрелся у власти? Нашел же его когда-то Александр Григорьевич, не по годам поставил председателем Белтелерадиокомпании, а он, помните, сколько наворовал...**

**Сергей АВТУХОВИЧ,**
**читатель "Народной воли" с первого номера.**

# Где Рыбаков?



Напомним, что Егор Рыбаков был освобожден от должности председателя Национальной государственной телерадиокомпании ГТРК 13 февраля 2004 года. Ему предъявили обвинение в получении взяток в крупном размере. Согласно озвученной официальной информации, прокуратурой по делу Рыбакова изъято денежных средств на сумму свыше 500 тысяч долларов.

Накануне рассмотрения дела в суде сторона обвинения представила в Верховный суд ходатайство о том, чтобы процесс был закрытым, обосновав свою просьбу тем, что во время разбирательства дела в качестве доказательств будут представлены материалы, якобы являющиеся государственными секретами. По версии прокуратуры, закрытым процесс сделали по причине обеспечения безопасности участников процесса в связи с поступившими от них просьбами.

Экс-председателя Национальной государственной телерадиокомпании Беларуси Егора Рыбакова приговорили к 11 годам лишения свободы с конфискацией имущества и лишением права занимать должности, связанные с выполнением организационно-распорядительных обязанностей сроком на 5 лет.

Поскольку дело слушалось в закрытом судебном заседании, в день оглашения приговора зачитали лишь его резолютивную часть.

*"Именем Республики Беларусь 11 января 2005 года судебная коллегия по уголовным делам Верховного суда Республики Беларусь рассмотрела в закрытом судебном заседании в городе Минске уголовное дело по обвинению Рыбакова Егора Владимировича, 19 ноября 1971 года рождения, уроженца города Новосибирска Российской Федерации, гражданина Республики Беларусь, проживавшего..., работавшего председателем Национальной государственной телерадиокомпании Республики Беларусь, образование высшее, ранее не судимого, женатого, имеющего на иждивении сына, 1 июля 1997 года рождения, военнообязанного, установила, что он виновен в совершении предъявленных ему обвинений, а поэтому, руководствуясь статьями 349, 364 Уголовно-процессуального кодекса, судебная коллегия по уголовным делам Верховного суда Республики Беларусь постановила признать виновным Рыбакова Е.В. в злоупотреблении служебными полномочиями, совершенными из корыстной заинтересованности должностным лицом, занимающим ответственное положение, и повлекшее тяжкие последствия в получении взятки, в покушении на получение взятки, совершенное должностным лицом, занимающим ответственное положение, повторно, за заведомо незаконные действия путем вымогательства в особо крупном размере, а также организацией легализации, отмывания материальных ценностей, приобретенных преступным путем, совершенный повтор, и в особо крупном размере",* — зачитал судья **Александр Райдудин**.

С Рыбакова также решено взыскать больше 212 миллионов рублей ущерба в пользу Белтелерадиокомпании, больше 20 миллионов рублей — в доход государства. Для добровольного исполнения данной части приговора Рыбакову предоставили срок до 1 апреля.

Срок отбывания наказания исчисляется с 13 февраля 2004 года.

В 2006 году Е.Рыбакову "скостили" два года.

### Уголовное дело

Несмотря на то, что материалы уголовного дела Егора Рыбакова были засекречены, кое-какие факты дела Рыбакова все же просочились наружу...

Например, в прессе писали, что Егор Рыбаков пытался приобрести для своей семьи домик в районе Цнянского водохранилища стоимостью около 500 тысяч долларов. Цнянский домик был оформлен на некую гражданку Каршакевич, которая, как писали в газетах, "в нотариальной конторе поставила свою подпись "там, где сказали". Дом в полмиллиона долларов был последней покупкой Рыбакова, правда, так до конца и не доведенной. Арест председателя НГТРК и невозможность получения всей суммы за дом заставили продавца расторгнуть сделку. Владельцу дома пришлось вернуть полученные им деньги, но уже не Рыбакову, а в прокуратуру.

В прессе писали и о других покупках Рыбакова. Например, он ездил на джипе "Судзуки Гранд Витара ХЛ 7" стоимостью, естественно, не в один десяток тысяч долларов. При обыске в квартире Рыбакова было обнаружено ювелирных изделий на 13 тысяч долларов, почти 40 тысяч долларов и 11 тысяч евро наличными. Летний отдых в Турции обошелся ему в сумму, превышающую 6 тысяч долларов. Были установлены два факта, когда Рыбаков давал взаймы по 60 тысяч и 70 тысяч долларов.

### Из архива

В 2003 году Егор Рыбаков неожиданно потребовал от "Народной воли" 200 миллионов рублей и по 20 миллионов от авторов публикации.

Поводом для обращения в суд послужило интервью, которое вышло еще в октябре 2001 года и в которой бывшая телеведущая Элеонора Езерская высказала свое мнение о той ситуации, которая сложилась в Белтелерадиокомпании под председательством Рыбакова. Дело рассматривал тогдашний судья Ленинского района г.Минска С.Хрипач. Можно только догадываться, как трудно было ему поставить последнюю точку в решении, но он все же не удовлетворил и близко иск Е.Рыбакова, хотя полностью и не отмел его. Он признал необходимым взыскать с редакции "Народной воли" 10 миллионов рублей, а с авторов — по миллиону.

Беларускіх майстроў да адказных спаборніцтваў рыхтуюць не толькі мясцовыя трэнеры, але і спецыялісты з-за мяжы. Паводле слоў кіраўніка асацыяцыі, сёння ў цырульніцкім майстэрстве лідзіруюць пяць краін — Расія, Францыя, Італія, Германія і Японія.

Як паведаміў Вайцяхоўскі, у 2009 годзе ў Беларусі адбудуцца абласныя адкрытыя конкурсы па цырульніцкім майстэрстве. *"Раней яны былі закрытымі, цяпер у іх можа браць удзел любы ахвотны",* — зазначыў ён.

ПРИЯТНОГО АППЕТИТА

# «Картофель в кимоно» и «Гейша по-белорусски»

*Белорусские драники вкуснее и дешевле японских суши. Так считают представители оргкомитета конкурса "Продукт года" и интернет-магазина eda.by.*



На днях в одном из столичных кафе состоялась презентация их акции "АнтиСуши". Посетителям было предложено несколько десятков традиционно белорусских блюд, мастер-класс шеф-повара eda.by, также рассказ о традициях белорусского застолья.

*"В этом году мы решили сделать акцент на белорусской кухне,* — рассказал председатель оргкомитета конкурса "Продукт года" **Игорь Данилов.** — *Сегодня главный лозунг в стране — "Купляйце беларускае!". Импорту все труднее пробиваться к нам. Но с питанием у нас все не так плохо: можно легко накормить себя и только местными продуктами".*

Название проекта — "АнтиСуши" — не случайно: современный гурман давно привык к таким словам, как "суши", "фаст-фуд", "слоу-фуд", "фондю". Потому было решено напомнить о родных и не менее вкусных блюдах белорусской национальной кухни.

*"Мы ничего не имеем против суши,* — пояснил директор службы доставки интернет-магазина eda.by **Сергей Сидорович**. — *Но белорусская кухня сейчас забыта незаслуженно. Любовь к суши объясняется интересом к экзотике, грамотным пиаром и банальной данью моде. Думаю, народ скоро напробуется, и это пройдет. А вот белорусская, проверенная временем, кухня навсегда останется.*

*Вспомните, как писатели восхваляли славянскую кухню! Как Гоголь описывал вареники и галушки! Почему мы не можем обратиться к национальной кухне? К тому же к нам все чаще стали обращаться клиенты, которые хотели бы вместо мексиканского буритос заказать белорусские драники".*

Технологи и повара магазина начали разработки для кого-то новых, но по сути всего лишь забытых старых, белорусских блюд: копались в архивах, отыскивали старинные рецепты, экспериментировали. В результате чего столы просто ломись: драники, наливанка, мочанка, перепечь, копытка, цыприки...

Примечательно, что названия этих традиционно белорусских блюд имеют аромат востока. Так, картофельные дольки в кожуре со свежими овощами было решено назвать "Картофель в кимоно", мочанку — "Завтрак Йокодзумы", колдуны — "Картофельный тюнинг", а запеченный картофель с белыми грибами и шпиком — "Гейша по-белорусски". Такие названия были придуманы специально, чтобы привлечь любителей модной восточной кухни.

*"Главный козырь белорусской кухни — любое, даже самое дорогое, наше блюдо будет в три раза дешевле японского,* — пояснил Сергей Сидорович. — *Ведь для правильных суши привозят морских окуней, тунца, креветки из Японии... А для приготовления белорусского блюда нужно всего лишь собрать и приготовить то, что у нас под боком".*

На презентации шеф-повар eda.by **Александр Топтунов** устроил мастер-класс. Он поделился со всеми желающими секретами и вариантами приготовления белорусских блюд. Своим любимым блюдом Александр называет мочанку.

*"Интерпретаций ее приготовления — уйма,* — рассказал он. — *Мы сейчас используем наиболее традиционный: со сметаной, грибами, колбасой, ребрышками. Вообще, мочанка — это то, во что макают картофельные блины, хлеб. Потому это может быть и приготовленный на основе мясного бульона суп и даже сметанный соус. Сковорода с обжаренными яйцами и салом — уже мочанка..."*

Александр не только специализируется на белорусской кухне, но и называет ее своей любимой.

*"В свое время я успел поучиться и приготовлению суши, и много чему,* — пояснил он. — *Зная многое, я не считаю, что белорусскую кухню нужно отодвигать назад. Если мы продвигаем нашу литературу, музыку, фильмы, то почему не можем продвигать белорусскую кухню?"*

На презентации состоялась и мини-лекция о традициях белорусского застолья. Кулинарный эксперт **Татьяна Фадеева** поделилась секретами удачного угощения. Оказалось, что для белорусского гостеприимства характерны принудительные меры...

*"У наших предков существовала традиция, которая называлась "прымус",* — рассказала Татьяна. — *Существовало такое правило: когда за стол белорусской семьи приходили гости, хозяева не должны были сидеть с ними за столом. Они были обязаны ходить вокруг гостей, заставлять их есть и пить. Если застолье организовывалось по-другому, то гости могли сказать, что все было хорошо, но не было "прымусу". А это значило, что застолье провалилось".*

**Ольга ПРУДНИКОВА.**
**Фото автора.**



БЛІЦ

## Дзе і як Вы будзеце святкаваць Новы год?

**Гэта пытанне "Народная воля" задала некаторым беларусам.**

**Ірына ДАРАФЕЕВА, заслужаная артыстка Беларусі:**

— З'язджаць на святы даклада не збіраюся. Звычайна я адзначаю Новы год у коле сяброў — майго прадзюсера, яго сям'і і тых, хто да нас далучыцца. Перыядычна бывае, што мы да альбо пасля бою курантаў з'язджаем на выступленне. Але потым вяртаемся ў загарадны дом прадзюсера — менавіта там мы святкуем звычайна Новы год. Там ёсць каток, вялікая елка, якая стаіць у цэнтры яго. Пасля поўначы выходзім на гэты каток, запальваем бенгальскія агні. Дома гуляем ва ўсякія фанты, глядзім тэлевізар, пераключаючы каналы і ловячы сябе на экране.

**Віктар СВЕТЛЫ, студэнт:**

— Новы год — рэч спецыфічная. Здаецца, сямейнае свята, а маладая кроў патрабуе не толькі салатаў, тэлевізара і шампанскага ў цесным коле бацькоў, але і чаго-небудзь больш актыўнага. Таму выбар сёлета зрабіў на карысць сяброў: знойдзем дзікую ёлачку на Кунцаўшчыне, абвесім цукеркамі, паводзім карагодзікі, "замочым" Быка шампанскім — і грэцца на кватэру. А бацькам буду дасылаць СМС.

**Віка ТРЭНАС, паэтэса:**

— Я лічу Новы год святам дамашнім. Таму заўсёды праводжу яго ў коле сям'і. Хаця ў гэтым годзе ў мяне ўзнікла жаданне парушыць гэту традыцыю і адсвяткаваць не толькі з бацькамі, але і з сябрамі. Але гэта яшчэ будзе бачна... Што датычыцца майго ўспрымання такіх масавых агульнавядомых святаў, то я, як замкнёны чалавек, іх не вельмі люблю. Да масавых гулянняў у мяне душа не ляжыць...

**Яніна КАРОЛЬЧЫК, алімпійская чэмпіёнка:**

— Будзем адзначаць усёй сям'ёй, як звычайна, у прыватным доме свекрыві. Замест нейкіх прыгод аддаю перавагу сямейнай вячэры з праглядам любімых фільмаў. Ніякіх спецыяльных страў не плануем: проста будзем прытрымлівацца рэкамендацый, што любіць і не любіць Бык — знак наступнага года.

**Іван БУСЛАЙ, спявак:**

— Пакуль яшчэ не ведаю, ці буду я працаваць у сам Новы год. 30 снежня дакладна выступаю... Мне падаецца, вячоркі за сталом і іншыя традыцыйныя навагоднія забавы — ужо мінулае. Для мяне свята — сустрэць Новы год на працы.

**Аляксандр ВАСІЛЕВІЧ, кіраўнік прыватнага прадпрыемства:**

— Хацелася б з'ехаць туды, дзе зараз сапраўдная зіма. Але, на жаль, у сувязі з апошнімі падзеямі наўрад ці гэта атрымаецца. Таму будзем арганізоўваць зімовую атмасферу дома — з сапраўднай ёлкай, упрыгажэннямі, камінам, новымі стравамі. Можа, запросім Дзеда Мароза са Снягуркай.

**Уладзімір АРЛОЎ, пісьменнік:**

— Жыццё маё ў апошні час склалася так, што прыйшлося трапіць на аперацыйны стол, дзе другое нараджэнне набыло маё сэрца. Таму шмат цікавых ідэй давялося адкласці на наступны год. У тым ліку, паездку ў Рым, замест якой, як раней паведамляла "Народная воля", я набыў велатрэнажор. Таму гэты Новы год буду сустракаць дома. Мару з'есці гуся ці качку, выпіць келіх чырвонага віна, пабачыць сяброў. Хачу развітацца з цяжкім 2008 годам, у які сышлі некалькі блізкіх мне людзей. Але я захаваю ўдзячнасць яму — таму што я тут — і за гэта падыму келіх чырвоненькага.

**Арнольд РАНЦАНЦ, заслужаны артыст Украіны і Беларусі:**

— Маё самае любімае свята — Новы год. Адзначаю яго заўсёды толькі дома. У нас з жонкай традыцыя на кожны Новы год запальваць свечкі, якія ў нас падарожнічаюць з аднаго Новага года ў другі. Ёсць яшчэ задумка нарэшце выканаць сваю мару — зрабіць на свята запечаную індычку. Спадзяюся, жонка падтрымае мяне ў гэтай ідэі і дапаможа з ажыццяўленнем. Жадаю зрабіць свята для сябе! Таму што лічу, зараз знаходжуся менавіта ў тым узросце, калі трэба ні ў чым сабе не адмаўляць.

**Валерыя ЕСІНА.**

ЧУЛІ?

## «Беларусьфільм» шукае мастакоў-пастаноўшчыкаў

**Студыя мультыплікацыйных фільмаў Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" пашырае штат мастакоў-пастаноўшчыкаў.**

"У стварэнні фільма гэта другая пасля рэжысёра фігура — ён адказвае за мастацкае вырашэнне карціны, распрацоўвае вобраз персанажаў і фонавыя эскізы", — сказаў дырэктар студыі мультыплікацыйных фільмаў **Пётр Крывастаненка**.

Пашырэнне штату спатрэбілася ў сувязі з павелічэннем выпуску мультфільмаў. У Беларусі няма ніводнай вышэйшай навучальнай установы, дзе рыхтавалі б спецыялістаў для анімацыйнага кіно. Цяперашнія спецыялісты беларускай мультыплікацыі атрымалі адукацыю ў расійскім Вышэйшым дзяржаўным інстытуце кінематаграфіі.

Год таму праблему недахопу мастакоў-мультыплікатараў вырашылі праз набор на бясплатныя курсы на базе кінастудыі. Тады з 700 прэтэндэнтаў на навучанне было адабрана прыкладна 20 чалавек. Амаль усе студэнты вытрымалі некалькі прамежкавых экзаменаў, і ўжо ў наступным годзе іх імёны з'явяцца ў цітрах беларускіх мультфільмаў.

Абавязковыя ўмовы для тых, хто вырашыў паспрабаваць сябе ў ролі мастака-пастаноўшчыка мультыплікацыйнага кіно: наяўнасць мастацкай адукацыі, веданне профільных камп'ютэрных праграм і, вядома, цікавасць да мультыплікацыі. Усіх, хто пройдзе адбор, спецыялісты абяцаюць навучыць тонкасцям анімацыйнага кіно. Творчы конкурс адбудзецца 23 і 25 снежня на кінастудыі.

## Руслан Аляхно збіраецца набыць дом і яхту ў Маямі

**"Паважаная "Народная воля"! Нядаўна ў інтэрнеце з'явілася навіна пра тое, што да пачатку вясенне-летняга сезона наступнага года беларускі спявак Руслан Аляхно прадставіць сваю калекцыю ніжняй бялізны. Не маглі бы вы запытацца ў Руслана, які ўдзел асабіста ён прымае ў распрацоўцы мадэляў? І чаму свой выбар хлопчык спыніў менавіта на бялізне? Ці з'явіцца гэтая калекцыя ў Беларусі або будзе прадстаўлена толькі ў Еўропе? Якой бялізне сам Аляхно аддае перавагу? І — галоўнае — колькі ён плануе зарабіць на гэтым?**

**З павагай —**

**Таццяна ГУСЕВА,**
**Мінск.**

Гэтыя пытанні "Народная воля" задала Руслану Аляхно падчас прамой лініі, якую ён праводзіў на сайце kp.by.

*"Зараз ідзе перыяд падпісання дакументаў,* — каротка адказаў спявак. — *Калекцыя будзе прадстаўлена ў Еўропе, Расіі і, можа быць, у Беларусі. Бялізну нашу (смяецца). Мяркую, што зараблю на гэтым праекце немаленькія грошы. Набуду дом, яхту і кватэру ў Маямі".*

**Аліна ВЕТРАВА.**

НОВЫЕ ИМЕНА

*Иллария ВЕЧЕР:*

# «Художник-миротворец не приступит к работе больным и депрессивным...»

**В холле ректората БГУ проходит выставка "Свет" Союза художников-миротворцев, который сейчас проходит процесс регистрации как международная общественная организация. По словам одного из инициаторов создания организации Сергея Рахлея, у художников-миротворцев уже было бы свое объединение, но структуры других стран не успели вовремя собрать необходимые для регистрации документы.**

**О том, кто такие эти художники-миротворцы и зачем им свой союз, "Народная воля" беседовала с вдохновительницей проекта художницей Илларией Вечер.**

— Художники имеют право выражать любые эмоции и любые идеи в творчестве: и мир, и войну, и насилие, — *говорит Иллария.* — Но всегда есть две альтернативы — позитивная и негативная. И та, и другая имеет право на существование. И везде все это вместе, вперемешку. Каждый может выплеснуть на полотно и страдания, и беды, и стрессы, и боль. Но этого так много в мире, что уже просто задыхаешься. Потому что Земля — это все-таки рай. Для воплощения этого рая мы и создаем первый в мире международный союз художников-миротворцев.

Сам проект "Мастер-миротворец" существует уже около пяти лет. В нем участвуют состоявшиеся мастера, которые сознательно и очень глубоко работают над своим духовным развитием, которые пришли к пониманию того, что они трудятся ради мира и света. Ведь если в этот мир привносить тьму, то светлее не станет. Через боль и страдания преобразовать мир в лучшую сторону невозможно. Чтобы было светлее — нужно привносить свет.

**— Некоторые люди считают, что талант пробуждают имено боль и страдания...**

— Представьте: у вас есть друг-художник, у которого был тяжелый период жизни, депрессия. Кто-то его обидел, оскорбил, в автобусе нахамил, и вот он совсем удрученный приехал домой и сделал себе арт-терапию. Взял прекрасные краски и выплеснул на холст свое уныние, свои обиды — все, что накопилось внутри. Прошло время, этот художник, может, и забыл уже, в каком состоянии писал ту картину. И дарит ее вашему ребенку на день рождения. Вы вешаете ее над кроватью ребенка. И этот негатив может сказаться на его будущем.

Многие художники и их жены кончали жизнь самоубийством. Они писали правду, но эта правда не вела к свету. Правда должна быть такой светлой, чтобы люди забыли о войне. Она должна лечить от недугов. Соответствовать этой правде — тоже тяжелый труд. Это покаяние и причастие ежедневное. И многократное в течение дня. И тогда человек может творить только в состоянии гармонии и радости.

Художник-миротворец никогда не приступит к работе, будучи больным, усталым, депрессивным. Такое состояние для него вообще неестественно.

**— А Белорусский союз художников, в котором вы состоите, не воспримет новое объединение как конкурентов?**

— Мы не хотим ничего оспаривать, нам не нужна конфронтация. Мы просто создаем союз художников-миротворцев, которые будут привносить светлое ядро в мир. Уже откликнулись люди из самых разных мест. Кроме белорусов, в союзе будут художники из Франции, Германии, России, Украины, Китая...

**— Проект благословлен митрополитом Филаретом. Получается, в нем могут участвовать только православные художники?**

— Конечно, религия не является принципиальной. В нашем проекте участвуют художники из разных стран. И, безусловно, мы уважаем культуру и религию каждого народа.

**Вальжина КОРСАК.**

## МОЗАИКА

### Слабых не осталось

В минувшую пятницу состоялась жеребьевка Лиги чемпионов.

В 1/8 финала встретятся: "Арсенал" (Англия) — "Рома" (Италия), "Вильярреал" (Испания) — "Панатинаикос" (Греция), "Лион" (Франция) — "Барселона" (Испания), "Реал" (Испания) — "Ливерпуль" (Англия), "Интер" (Италия) — "Манчестер Юнайтед" (Англия), "Спортинг" (Португалия) — "Бавария" (Германия), "Атлетико" (Испания) — "Порту" (Португалия), "Челси" (Англия) — "Ювентус" (Италия).

Первые матчи 1/8 финала Лиги чемпионов состоятся 24 и 25 февраля, ответные — 10 и 11 марта.

### С показом спорта у нас все в порядке

Компания "T.E.A.M. Marketing", представляющая финансовые интересы УЕФА, уведомила Белорусскую государственную телерадиокомпанию о ее победе в тендере на право показа матчей Лиги чемпионов на территории Беларуси в течение трех ближайших сезонов — с 2009-го по 2012 год.

Заместитель главного директора Главной дирекции спортивного вещания БГТРК Александр Казюкевич отметил, что со следующего еврокубкового цикла дирекция планирует значительно расширить формат освещения самого престижного клубного турнира континента. Число показанных матчей увеличится как минимум вдвое. Это будет достигнуто за счет размещения трансляций не только на "Первом канале", но и еще на двух принадлежащих компании "кнопках" — "Ладе" и "НТВ-Беларусь".

### Скорбим...

В конце прошлой недели скоропостижно скончалась 26-летняя гандболистка гомельского клуба и национальной сборной Беларуси **Ольга Кондратьева**.

По сообщению "Прессбола", около месяца назад на сборе она почувствовала боли в груди и отпросилась из Стаек на обследование в родной Гомель. Тамошние доктора диагностировали пневмонию. Стационарное лечение в 1-й Городской больнице продолжалось почти месяц. Однако странным образом затянувшийся недуг не отступал. Перевод на новое место лечения обернулся бедой. В приемном покое Ольга внезапно потеряла сознание. Вызванные на помощь реаниматологи констатировали смерть...

**Алесь СВЕТЛАНИЧ.**

## З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

*Лепшая спартсменка Беларусі Аксана МЯНЬКОВА:*

# «Самае вялікае выпрабаванне для мяне — візіт да стаматолага»

**Карэспандэнт "Народнай волі" даведаўся, чаму алімпійская чэмпіёнка ў кіданні молата Аксана Мянькова паміж паступленнем у медыцынскую вучэльню і прафесійнымі заняткамі лёгкай атлетыкай выбрала спорт.**



Для магіляўчанкі Аксаны Мяньковай адыходзячы год стаў сапраўды феерычным. Пасля заваявання алімпійскага золата ў Пекіне яна цалкам заслужана названа лепшай спартсменкай Беларусі.

— Ды вы што?! — у голасе спартсменкі адчуваецца лёгкая разгубленасць. — Напэўна, гэта жарт. Нічога пра гэта не чула, вы першы, хто мне пра гэта сказаў. Прыемна і нечакана...

**— Не, жартаваць з алімпійскімі чэмпіёнкамі — не мой канёк. Аксана, раскажыце, калі ласка, як пасля Алімпіяды змянілася ваша жыццё?**

— Адразу цяжка адказаць... Шчыра кажучы, я не была гатова да такой увагі да сябе, бо па жыцці я чалавек даволі сціплы. А тут такое... У родным Магілёве мяне сталі часцей пазнаваць на вуліцах, а на гарадскім рынку, куды я хаджу за прадуктамі, і ўвогуле рэгулярна бяруць аўтографы...

**— Аксана, а як вас занесла ў такі не зусім жаночы від спорту?**

— Шчыра? Увогуле напачатку я хацела займацца веславаннем, фактура дазваляла. Аднак, пабачыўшы, як дзяўчаты, якія рыхтуюцца да выступлення, ранняй вясной лёд вёсламі заграбаюць, перадумала. Далей спрабавала займацца штурханнем ядра, але гэтая дысцыпліна лёгкай атлетыкі мяне таксама не прывабіла. У рэшце рэшт спынілася на кіданні молата. І ведаеце, даволі лёгка мне гэта давалася, так і выбрала "свой" від спорту.

**— Ведаю, што вы даволі доўга выбіралі паміж прафесійнымі заняткамі спортам і паступленнем у медыцынскую вучэльню. Чаму спорт пераможа?**

— На паступленні ў медыцынскую вучэльню больш за іншых настойвала мая мама. Яе зразумець можна, бо амаль усе сваякі па матчынай лініі так ці іначай звязаны з медыцынай. Але я стала выключэннем. А справа ў тым, што я, дарослы чалавек, вельмі-вельмі баюся дактароў. Паліклінікі і бальніцы я стараюся абыходзіць за кіламетр! Візіт да стаматолага для мяне — выпрабаванне, а ад крыві мяне ўвогуле ўводзіць у ступар. Большага катавання, чым здаваць кроў з пальца, для мяне прыдумаць складана. Па мне, дык куды лепш молат кідаць...

**— Ну вось і дакідаліся да алімпійскага золата. Калі не сакрэт, раскажыце, як патрацілі свой алімпійскі ганарар?**

— Шчыра кажучы, яшчэ ніяк... Аднак, хутчэй за ўсё буду ўкладваць грошы ў будаўніцтва жылля...

**— Пачакайце, а як жа абяцанні чыноўнікаў аб забеспячэнні пераможцаў Алімпіяды кватэрамі?**

— Па праўдзе, я сама гэтым пытаннем не цікавілася, ды і мне пакуль што ніхто не тэлефанаваў... Зараз мы разам з мужам, як і раней, жывём у інтэрнаце. Паляпшэнне жыллёвых умоў нашай сям'і не пашкодзіла б. Гэтае пытанне я паспрабую высветліць на Алімпійскім сходзе, які, як вядома, адбудзецца 16 студзеня будучага года.

**— Паколькі вы ўзгадалі пра мужа, не магу не запытацца: як вы з ім пазнаёміліся? Чым ён вас пакарыў?**

— Алег — таксама спартсмен. У свой час ён займаўся веславаннем. Праўда, ён быў вымушаны спыніць заняткі з-за траўмы. Спорт нас і пазнаёміў. Пачыналася ўсё з паходаў у госці адзін да аднаго. Непрыкметна мы сталі бачыцца ўсё часцей і часцей, а потым Алег прапанаваў выйсці за яго замуж.

**— Здагадваюся, што карміць мужа вам ёсць чым. Маю на ўвазе "каўбасны рай" абяцаны пераможцам Алімпіяды адным са спонсараў беларускай зборнай. Каўбаса да вячэры на стале ёсць заўсёды?**

— Кантракт на дастаўку "алімпійскага" мяса я падпісала адразу пасля вяртання з Пекіна. Спонсар выконвае свае абавязкі спраўна. Праўда, па шчырасці, каўбасу я амаль не заказваю. Не люблю я яе ні ў якім выглядзе — ні вараную, ні сыравэнджаную. Затое без вэнджанага ці смажанага мяса я жыць не магу. Дыет ніякіх не прытрымліваюся, я ж не мастацкай гімнастыкай займаюся...

**— Аксана, пасля феерычнага 2008 года якія планы на год будучы?**

— Першая і асноўная задача для мяне на будучы год — трапіць на чэмпіянат свету. А калі браць далёкую перспектыву, то, безумоўна, мару аб паўтарэнні алімпійскага поспеху. Бо тыя эмоцыі, якія я адчула, стоячы на вышэйшай прыступцы алімпійскага п'едэстала, трэба асвяжыць...

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**

## ШАШКІ

### Практык і кампазітар

Майстар спорту Віталь Варушыла (Мінск), які даволі паспяхова выступае ў турнірах па міжнародных шашках, у апошні час актывізаваўся і як шашачны кампазітар. Яго задумкі, якія ён даслаў у рэдакцыю, заслугоўваюць вашай увагі:



1.**Белыя:** b6, c5, d4, g5, h6 (5).
**Чорныя:** a7, e7, f6, g3 (4).

Пашукайце выйгрыш за белых у рамках бліца-**58/1**, пераможца якога будзе заахвочаны. Чакаем адказы па адрасе: **220030, Мінск, вул. Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля", "Шашкі".**

2.**Белыя:** b2, b4, c3, c5, d6, h4 (6). **Чорныя:** a5, d8, e3, f6, g5 (5). Перавага белых. Пераканайцеся ў гэтым самі. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

3.**Белыя:** 25, 30, 31, 32, 37, 39, 41 (7). **Чорныя:** 5, 14, 21, 23, 26, 40 (6). Змест: 34, 24, 32-27, 10, 14x.

4.**Белыя:** 27, 28, 32, 38, 41, 44, 45, 49 (8). **Чорныя:** 8, 9, 13, 16, 18, 20, 30, 43 (8). Атака белых: 27-22, 21, 37, 32, 43, 12x.

В.Варушыла — член Рэспубліканскай камісіі па шашачнай кампазіцыі, вядзе рубрыку "Шашкі" ў газеце "Спартыўная панарама".



### Разнавіднасці гульні

"Дзякуй за ўсё, што робіце для ўсіх нас. У мяне ёсць электронныя праграмы па рускіх, бразільскіх і амерыканскіх шашках. Чым яны адрозніваюцца?" — пытае першаразрадніца з Вілейкі Аляксандра Камінская.

У Пекіне адбыліся першыя Сусветныя інтэлектуальныя гульні па шахматах, го, брыджу і шашках, у тым ліку па іх пералічаных вышэй відах на 64-клетачнай дошцы. Таму пытанне актуальнае, цікавае і для іншых нашых чытачоў. Адказваем на яго: у бразільскія шашкі гуляюць па правілах міжнародных (стоклетачных), а ў амерыканскіх (чэкерсе) простай нельга біць назад, дамка рухаецца на адно поле ў любым напрамку і збівае сілы праціўніка на бліжэйшыя ад яе свабодныя палі.

А цяпер, дзякуючы В.Варушыле, прыводзім прыклады, прычым з інтэлектуальнай алімпіяды:

1.**Белыя** (А.Валюк): a1, a3, c1, d2, f2, g3, h2, h4 (8). **Чорныя** (М.Альшанецкі): a5, c5, c7, d8, e5, f4, f8, h8 (8). Беларускі міжнародны гросмайстар паграла жаў 1. ab4 a:e1(у бразільскіх шашках біць большасць фігур абавязкова) 2. hg5 3. gh4 4. h:b8x. Чорныя заўважылі камбінацыю і ліквідавалі "рэшата" ходам cd6, але прайгралі пазіцыйна.

2.**Белыя** (А.Валюк): a3, c1, c3, e1, f4, g1, h4 (7). **Чорныя** (Рычард Валужыс): a5, b6, b8, d6, e5, f8, g7 (7). У партыі было: 1. hg5! 2. ef2 g:e1Д (а не 2...g:b4Д, як у рускіх шашках) 3. gh6 4. a:e7 5. h:f8x.

3.**Белыя:** a5, b2, d2, дамка h4 (4). **Чорныя:** a3, e5, e7, h2, дамка g1 (5). Перад вамі эпізод барацьбы ў чэкерс (паказаў нам наш чытач з Наваполацка Пётр Шклудаў, а яму па электроннай пошце — экс-масквіч Аляксандр Маісееў (зараз — ЗША): 1. hg3! a:c1D (1...h:f4 не дазваляецца. У бразільскіх жа шашках ідзе 1...a:e3 і a3 застаецца простай, у рускіх — 1...a:e3/f4/g5/h6D ці 1...h:f4) 2. gf2! c:e3A 3. f:d8=. A2...g:e3 3. d:f8=. Партыя завяршаецца ўнічыю, бо матэрыялу засталося пароўну.

Дарэчы, чэмпіёнамі гульняў сталі: па амерыканскіх шашках — А. Маісееў, па бразільскіх — Алег Дашкоў (Расія), па рускіх — Вікторыя Матрычка з Украіны (сярод мужчын турнір не праводзіўся) і па стоклетачных — расіянін Аляксандр Георгіеў (мужчыны), а ў жанчын — эксмінчанка Зоя Голубева (Латвія).

### Самаправерка

**Бліц-57/6** (М.Грушэўскі): 1. ef8 2. f6-g7! 3. dc7 4. f:h8x.

**Па-за конкурсам** (М.Грушэўскі): 4...ef2 5. hg3 6. cb2 a:c3 7. h:b2/a1 hg3 8. b/ad4x.

Заданні бліца-57/1-4 выканалі: А.Перавознікаў і У.Сапяжынскі (Рагачоў), Л.Жыхар (Мядзел), Б.Завадскі (Брэст), А.Янчук (Камянец), Марыя Лічко, Дар'я Малашка, Я.Казлоў, Р.Аль-Карані, А. і А.Яраховічы (Уздзенскі раён), У.Голуб, В.Рубінчык, А.Сняжкоў і В.Шульга (Мінск), А.Чумакоў (Светлагорск), П.Шклудаў, А.Камінская і іншыя.

**Мікалай ГЛАДКІ.**

## ШАХМАТЫ

### Белорусский чемпион

Исполнилось 95 лет со дня рождения всемирно известного белорусского шахматного композитора, единственного в Беларуси международного мастера и международного арбитра по шахматной композиции Вацлава Евгеньевича Гебельта (1913--1999 гг.). Гебельт был родом из деревни Лабно, ныне Гродненская область. С шахматами он познакомился, когда учился в средней школе. А шахматной композицией увлекся, когда учился в Варшавском университете. Свою первую композицию опубликовал в 1933 году в Варшаве. В этот период Гебельт познакомился с известными польскими мастерами Давидом Пшепюркой, в годы войны погибшем в Варшавском гетто, и Мариамом Врубелем, которые оказали большое влияние на начинающего шахматного композитора. После окончания университета Гебельт на время оставил шахматную деятельность. К активным занятиям шахматной композицией он вернулся в конце 40-х годов, когда переехал на жительство в город Лиду Гродненской области. Особенно плодотворными были для него 50-е годы, но и в последующий период было немало достижений. Велик перечень его успехов и наград. С 1933 года Гебельт опубликовал 600 задач всех жанров, из которых более 300 были отмечены на конкурсах. В том числе более 140 были награждены призами, из которых 53 -- первые. Гебельт неоднократно выигрывал чемпионаты Беларуси, добивался выдающихся успехов на всесоюзной и международной арене. Он стал чемпионом СССР в разделе двухходовых задач в V первенстве СССР, по итогам которого ему было присвоено звание мастера спорта СССР. Гебельт также дважды становился чемпионом СССР, еще 5 раз призером в составе сборной БССР, чемпионом мира в составе сборной команды СССР. В 1960 году он победил в Олимпийском конкурсе в Лейпциге по разделу кооперативных задач, а в 1980 году в таком же конкурсе в Москве по разделу двухходовых задач. В 1977 году Гебельту было присвоено звание международного мастера, а через два года -- международного арбитра по шахматной композиции.

Одну из задач выдающегося мастера, которая была отмечена 1--2 призом на международном конкурсе польского шахматного журнала "Szachy" в 1958 году мы предлагаем вниманию читателей.

### В.Гебельт



**Белые:** Кра8, Фа7, Лd5, Ле1, Сh1, Сh4, Кd3, Ке7, пп. с5, g6, h5 (11).

**Черные:** Кре6, Фе5, Ле4, Кf2, пп. с6, d6, g7 (7).

**Мат в 2 хода.**

Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная воля", "Шахматы".**

### Мемориал Ю.Новикова

В Минске в Республиканском центре олимпийской подготовки по шахматам и шашкам прошел традиционный турнир памяти известного белорусского журналиста и шахматиста Юрия Новикова. Соревнования эти стали традиционными, нынешний турнир стал уже 14-м по счету с 1995 года. Традиционной была и программа. Она включала турниры по молниеносной игре для ветеранов, массовый турнир и финал, в котором приняли участие ведущие спортсмены республики. На всех этапах турниры проводились по швейцарской системе в 9 туров. В соревнованиях ветеранов выступили 32 шахматиста в возрасте от 60 до 82 лет. Здесь победу одержал международный мастер Абрам Ройзман, набравший 8 очков из 9 возможных. В массовом турнире лучшим был кандидат в мастера Игорь Клиза -- 7,5 из 9. Наибольший интерес вызвал финальный этап, среди участников которого были международные гроссмейстеры, члены сборной Беларуси, выступавшие на Олимпиаде в Дрездене, Алексей Александров, братья Андрей и Сергей Жигалко, а также Юрий Тихонов, Игорь Люцко, Елена Заяц, международные мастера Надежда Азарова, Владимир Романенко, Кирилл Ступак, Евгений Подольченко, Павел Ломако, Дмитрий Новицкий, Сергей Хамицкий. В острой борьбе уверенную победу одержал Алексей Александров. Набрав 8 очков (7 побед при 2 ничьих) он завоевал первый приз. На 1,5 очка отстал 18-летний международный мастер Кирилл Ступак, ставший вторым.

По 6 очков набрали мастер спорта Сергей Михайловский и гроссмейстер Андрей Жигалко, разделившие 3--4-е места. На пол-очка меньше у гроссмейстера Игоря Люцко, международных мастеров Павла Ломако, Владимира Романенко, Евгения Подольченко и кандидата в мастера Андрея Горовца. У женщин приз завоевала международный мастер Надежда Азарова -- 5 очков из 9.

Спонсорами Мемориала Новикова, как и прежде, выступили минский предприниматель Петр Герасимович и Международная телерадиокомпания "Мир".

### Чемпионат ветеранов

Звание чемпиона мира среди ветеранов завоевал международный мастер Ларри Кауфман (США), набравший в 11 встречах 9 очков. Он по дополнительным показателям опередил румынского гроссмейстера М.Шубу, ставшего серебряным призером. Бронзовую медаль выиграл М.Цебало из Хорватии -- 8,5. Такой же результат показали: 4.Б.Хануков (Германия), 5.А.Захаров (Россия), 6.экс-чемпион мира среди ветеранов Я.Кловакс (Латвия). Чемпионкой мира среди женщин стала Тамара Вилерте (Латвия), серебро у россиянки Г.Струтинской, бронза -- у Т.Фоминой (Эстония), четвертая -- у Э.Эпштейн (США). Белорусские ветераны, можно сказать, "как обычно", в чемпионате не выступали из-за отсутствия средств.

## ВНЕ ИГРЫ

# Баскетбол ожидают перемены?

**После отчетно-выборной конференции Федерации баскетбола, которая состоится 24 декабря, спортивная общественность ожидает перемен в этом виде спорта.**




Наша газета уже сообщала, что на конференции ожидается смена руководства. Оно и понятно — в нашем баскетболе уже давно надо было что-то менять. Безденежье привело к тому, что главного тренера сборной Беларуси искали через объявление в газете. Причем сообщалось, что претендовать на "главного" может любой желающий. В итоге выбрали Александра Попкова.

— За отечественный баскетбол очень обидно, — рассказывал затем Александр Леонидович "Народной воле". — В других странах этот вид спорта прогрессирует, а у нас какой-то застой. Нет денег — нет развития. Перед назначением я поднимал эту тему, но мне дали понять, что на сегодняшний день пока сделать ничего не могут. У нас есть какие-то ставки, категории, разряды, и мы не можем через них перешагнуть. Честно говоря, иностранным специалистам, с которыми общаюсь, никогда даже не говорю о наших окладах. Стыдно ведь! Сегодня в спорте без медикаментозного обеспечения, биодобавок и продуманного питания для спортсменов результата не будет. Но на все это нужны большие средства, которых у нас нет. Я же не один год езжу на разные чемпионаты Европы и вижу, как обеспечиваются команды и какие специалисты их сопровождают. А у нас на сегодняшний день каменный век. Сборная Беларуси работает "от сохи". Все пока только на уровне лозунгов.

"За прошедшее неполное четырехлетие федерация сделала немало добрых дел, однако качественного скачка, увы, так и не совершила, — считают аналитики газеты "Прессбол". — По-прежнему детский баскетбол пребывает на задворках, национальный чемпионат, особенно женский, выглядит вещью в себе, клубы варятся в собственном соку, забыв, что такое еврокубки. Одна отрада — женская сборная, завоевавшая европейскую бронзу и достойно смотревшаяся на Олимпиаде".

Итак, смена руководства скорее всего произойдет. Произойдет ли после этого смена ситуации в нашем баскетболе?

**Алесь СИВЫЙ.**

## ВОКРУГ СПОРТА

### Азарт сгубил

Защитники Крейг Мур и Кевин Мускат оштрафованы Футбольной федерацией Австралии за игру на тотализаторе.

33-летний Мур и 35-летний Мускат включены главным тренером сборной Австралии Пимом Вербиком в расширенный список кандидатов в национальную команду страны. В прошлом оба игрока были капитанами сборной.

Мур и Мускат оштрафованы на три тысячи австралийских долларов (около двух тысяч долларов США) за ставки на матчи, в которых не принимали участие их команды. В настоящее время оба футболиста выступают за австралийские клубы. За свою карьеру Мур провел 40 матчей за сборную Австралии, а Мускат надевал футболку национальной команды 51 раз.

Еще один футболист, выступающий в чемпионате Австралии, шотландец Грант Бребнер, оштрафован на ту же сумму, а также дисквалифицирован на два матча за ставку на игру, в которой принимала участие его команда. Бребнер поставил против "Мельбурна", за который он выступает, в игре с тайским клубом "Тонбури" в азиатской Лиге чемпионов.

Информацию об игре футболистов на тотализаторе предоставила биржа ставок Betfair, у которой действует специальное соглашение с руководством австралийского футбола.

### Отравили российского фигуриста

Российский фигурист Максим Траньков, отравившийся во время финала Гран-при в Корее, рассказал, что в первые три дня после отравления он вообще ничего не ел.

Финал Гран-при 2008 года проходил с 10 по 14 декабря в Корее. Траньков и его партнерша Мария Мухортова заняли последнее (шестое) место в соревнованиях спортивных пар. По словам фигуриста, такой результат его не сильно расстроил.

### Добрый дядя Кинг!

Известный боксерский промоутер Дон Кинг намерен раздать сто тысяч индеек нуждающимся жителям пяти штатов.

Дон Кинг в течение уже 40 лет перед Рождеством дарит мясо птицы беднякам. В 2008 году промоутер рассчитывает накормить более двух миллионов человек.

По словам Кинга, за 77 лет своей жизни он не может вспомнить года, когда накормить людей было бы более важно, чем сейчас.

Промоутер отметил, что для многих американцев в 2008 году настали тяжелые времена, и особенно это касается штатов на побережье Мексиканского залива, пострадавших не только от финансового кризиса, но и от ураганов.

Индейки будут направлены в Техас, Луизиану, Миссисипи, Алабаму и Флориду.

### Ющенко просит позитива

Президент Украины Виктор Ющенко потребовал от чиновников, отвечающих за подготовку страны к чемпионату Европы по футболу 2012 года, нести в прессу только позитивные новости.

По словам Ющенко, если у чиновника есть возможность пообщаться с журналистами, то он должен нести позитивную тематику. В целом Ющенко дал положительную оценку тому, что было сделано в 2008 году для подготовки к чемпионату Европы. Свои заявления президент Украины сделал на координационном совете по подготовке и проведению Евро-2012.

Чемпионат Европы 2012 года должны принять Украина и Польша. На прошлой неделе президент УЕФА Мишель Платини заявил, что если строительство стадиона в Киеве не будет идти в намеченные сроки, то Украина может быть лишена права на проведение Евро-2012.

**Подготовил Алесь СВЕТЛАНИЧ.**

**Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а. Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871. Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906 E-mail : nv@promedia.by http://www.nv-online.info**

ISSN 2071-9647

**Падпісны індэкс: 63222**

**Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ**

**У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 22.12.2008 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 16 000 экз. Заказ №7082.**